ПРАВАСЛАЎНЫ
МАЛІТОЎНІК



# БЕЛАРУСКІ ПРАВАСЛАЎНЫ МАЛІТОЎНІК

Дабраславіў на выданьне

16 лютага году Божага 1966

Архіяпіскап ВАСІЛЬ

Кніжная дружына Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы ўдзячная ўсім удзельнікам у апрацаваньні гэтай кнігі на дабро, радасьць і спасеньне ўсім нам і нашаму Беларускаму народу.

Перад усімі заслужыліся:

Яго Прасьвячэнства Архіяпіскап Ньюёрскі й Віленскі ВАСІЛЬ.

Яго Прападобнасьць Архімандрыт Таронцкі й Тураўскі МІКАЛАЙ.

ЯгоПрападобнасьцьт Пратаярэй Мітрат СЬЦЯПАН ВАЙТЭНКА.

За выкананьне гэтае нашае працы хвалім Бога ў Тройцы Адзінага: Бога Айца, і Сына, і Сьвятога Духа цяпер і заўсёды, і на вякі вечныя.
Амін.

Першае выданьне
Гайленд Парк, Н. Дж.
1966

Другое выданьне
Таронта, Канада.
1990

# ПРАВАСЛАЎНЫ МАЛІТОЎНІК

Другое выданьне
папраўленае й дапоўненае

Кансысторыя
Беларускай Аўтакефальнай
Праваслаўнай Царквы

Таронта, Канада

1990

Дабраславіў на другое выданьне на беларускай мове Праваслаўнага Малітоўніка дня 25 сакавіка 1990 г., Таронта, Ант., Канада.

Архіяпіскап МІКАЛАЙ
Першы Ярарх БАПЦ

# РАНІШНІЯ МАЛІТВЫ

Як толькі рана ўстанеш, памыйся ды шчыра памаліся Госпаду Богу перад абразамі:

У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амін. (перахрысьціся тройчы)

Божа, будзь літасьцівы да мяне грэшнага(-ай). (тройчы, прыкладаючы кулак да грудзей)

Госпадзе Ісусе Хрысьце, Сыне Божы, Збауца наш, дзеля малітваў Маці Твае і ўсіх сьвятых, памілуй нас. Амін.

(Калаі-б сталася, што зусім ня маеш часу, скажы яшчэ малітву «Ойча наш» і законч; інакш, прадаўжай):

Слава Табе, Божа наш, слава Табе. Амін.

Уладару нябесны, Уцяшыцелю, Духу ісьціны, што ўсюды прысутны і ўсё напаўняеш, Скарбніца дабра й Жыцьцядацелю, прыйдзі і



ўсяліся ў нас і ачысьці нас ад усяго благога, і збаў, Добры, душы нашы.

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, памілуй нас. (тройчы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.

Найсьвяцейшая Тройца, зьлітуйся над намі. Госнадзе, ачысьці правіны нашы. Уладару, выбач бяспраўе наша. Сьвяты. наведай нас і аздараві немачы нашы дзеля імя Твайго.

Госпадзе. памілуй. (тройчы)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш нябесны! Сьвяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё ды станься воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штадзённага дай нам сёньня, і выбач нам правіны нашы, як і мы выба-



чаем вінаватым прад намі, і ня дай нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

Бо Тваё ёсьць валадарства, і сіла, і слава, АйцаД Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.

Устаўшы ад сну, прыпадаем да Цябе, Добры, і анёльскую песьню натхнёна пяем Табе: сьвяты, сьвяты, сьвяты Ты, Божа, Багародзіцай памілуй нас.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Госпадзе, што з пасьцелі й сну падняў мяне, прасьвятлі розум мой і сэрца маё, і вусны мае адчыні, каб пяяць Табе, Сьвятая Тройца: сьвяты, сьвяты, сьвяты Ты, Божа, Багародзіцай памілуй нас.

І цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.

Неспадзявана Судзьдзя прыйдзе, і выявяцца ўчынкі кожнага, таму апоўначы са страхам усклікнем:

сьвяты, сьвяты, сьвяты Ты, Божа, Багародзіцай памілуй нас.

Госпадзе, памілуй. (12 разоў)





## МАЛІТВА ДА СЬВЯТОЕ ТРОЙЦЫ

Устаўшы ад сну, дзякую Табе, Трыадзіны Божа, што дзеля Твае дабрыні й цярплівасьці не загневаўся Ты на мяне, лянівага й грэшнага, і не загубіў мяне зь бяспраўствамі маймі; але дзеля Свае чалавекалюбнасьці падняў мяне, які спачываў бяз памяці, каб я ранішняю малітваю славіў уладу Тваю. І цяпер прасьвятлі вочы духа майго, адчыні вусны мае пазнаваць навуку Тваю і разумець занаветы Твае, выконваць волю Тваю, і пяяць Табе зь вераю ў сэрцы, і ў песьнях славіць усесьвятое імя Тваё: Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.

Прыйдзеце, пакланемся Ўладару нашаму Богу.

Прыйдзеце, пакланемся й прыпадзем да Хрыста, Уладара, нашага Бога.



Прыйдзеце, пакланемся й прыпадзем да самога Хрыста, Уладара й Бога нашага.

## ПСАЛОМ 50/51 (каяльны)

Зьлітуйся нада мною, Божа, паводле ласкі Свае і дзеля вялікага міласэрдзя Свайго выбач бяспраўі мае.Абмый мяне ўсяго ад правінаў маіх і ачысьці мяне ад грэху майго. Бо сваё бяспраўе я ведаю, і мой грэх усьцяж прада мною. Прад Табой, Табой адным я зграшыў і благое ў вачох Тваіх зрабіў, так што Ты справядлівы ў слове Сваім і беззаганны ў судзе Сваім. Восьжа ў бяспраўі я радзіўся, у грэху мая маці зачала мяне. Вось Ты жадаеш праўды ўнутры і схаваную мудрасьць аб'явіў мне. Ачысьці мяне ізопам і буду чысты: абмый мяне і буду бялейшы за сьнег. Дай мне пачуць радасьць і весялосьць. няхай весяляцца косьці, Табою пакрышаныя. Адвярні аблічча Сваё ад грэху майго і ўсе мае бяспраўі



выбач мне. Сэрца чыстае ствары ўва мне, Божа, і дух моцны аднаві ўва мне.Не адгані мяне ад аблічча Свайго і Свайго Духа Сьвятога не адбірай ад мяне. Зьвярні мне радасьць Свайго збаўленьня і падмацуй мяне Тваім свабодным духам. Буду навучаць адступнікаў шляхоў Тваіх, і грэшнікі будуць вяртацца да Цябе. Вызваль мяне ад крывавай помсты, о Божа! Божа майго збаўленьня, і пяяць будзе язык мой справядлівасьць Тваю. Адчыні вусны мае, Госпадзе, і вусны мае прагалосяць хвалу Тваю. Бо Ты ня хочаш крывавых ахвяраў; я даў-бы ўсепаленьне,але Табе ня будзе прыемна. Ахвяра Богу - дух зломлены: зломленым і пакорным сэрцам, о Божа,Ты не пагарджаеш! Дабро ўчыні Сыёну з ласкі Твае, пабудуй сьцены Ерусаліму. Тады Ты ласкава прымеш ахвяру праўды, усепаленьня і агністыя аброкі; тады пакладуць цялят на ахвярнік Твой.

## СЫМБАЛЬ ПРАВАСЛАЎНАЙ ВЕРЫ

Верую *ў* адзінага Бога Айца, усеўладарнага, Тварца неба і зямлі, усяго бачнага й нябачнага.

І ў адзінага Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага, адзінароднага, ад Айца роджанага перад усімі вякамі: Сьвятло ад Святла, Бога праўдзівага ад Бога праўдзівага, нястворанага,але народжанага, адзінаіснага з Айцом, празь Якога ўсё сталася.

Ён дзеля нас, людзей, і дзеля нашага збаўленьня зыйшоў зь неба й прыняў цела ад Духа Сьвятога й Дзевы Марыі, і стаўся Чалавекам; быў укрыжаваны за наспры Понцкім Пілаце, і пакутаваў і быў пахаваны і ўваскрос на трэці дзень, згодна зь Пісаньнем; узыйшоў у нябёсы і сядзіць праваруч Айца; і зноў прыйдзе ў славе судзіць жывых і памерлых, і Ягонаму валадарству ня будзе канца.

Верую ў Духа Сьвятога, Госпада



жыцьцятворчага, Які ад Айца зыходзіць, Каму нароўні з Айцом і Сынам пакланеньне й слаўленьне належаць, і Які вяшчаў праз прарокаў.

Верую ў адзіную Сьвятую, Саборную і Апостальскую Царкву.

Вызнаю адзін хрост на збаўленьне ад грахоў.

Чакаю ўваскрасеньня памерлых і жыцьця будучага веку. Амін.

## МАЛІТВА

## СЬВ. МАКАРА ВЯЛІКАГА

Божа, ачысьці мяне грэшнага, бо ніколі я не зрабіў нічога добрага прад Табою, але вызваль мяне ад нячыстага, і няхай будзе ўва мне воля Твая, каб я беззаганна адчыніў нягодныя вусны мае і славіў імя Тваё сьвятое: Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.



## ДРУГАЯ МАЛІТВА

## СЬВ. МАКАРА ВЯЛІКАГА

Да Цябе, Уладару чалавекалюбны, устаўшы ад сну сьпяшаюся, насьледаваць Цябе жадаю дзеля міласэрдзя Твайго, і прашу Цябе: памажы мне ў кожным часе, у кожнай рэчы, і ахавай мяне ад усякіх людзкіх благіх учынкаў і д'ябальскае спакусы, і збаў мяне, і ўвядзі ў валадарства Тваё вечнае. Бо Ты мой Творца і ўсякага дабра Крыніца й Падаўца, і на Цябе ўся надзея мая, і Табе хвалу аддаю цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.

## МАЛІТВА

## ДА АНЁЛА АХОЎНІКА

Сьвяты анёле, памочніча стурбованай душы мае й крапатлівага жыцьця майго, не адыходзь ад мяне за нястрыманасьць маю, ня дай злому духу сілком завалодаць сьмяротным целам маім. Узмацні зьняможаныя й слабыя сілы мае і накіруй мяне на шлях збаўленьня. Так, сьвяты анёле Божы, абаронца й ахоўнік мае беднае душы й цела, усё мне выбач, чым я крыўдзіў цябе праз усё жыцьцё маё, і калі я ў нечым зграшыў мінулае начы, заступіся за мяне гэтага дня і ахавай мяне ад усякае згубнае спакусы, каб я ніякім грэхам не ўгнявіў Бога, і маліся за мяне да Госпада, каб Ен даў мне добры посьпех і зрабіў мяне годным слугою дабрыні Свае. Амін.

## СЛАЎЛЕНЬНЕ НАЙСЬВЯЦЕЙШАЕ БАГАРОДЗІЦЫ

радатная Марыя, Госпад з Табою. Дабраславёна Ты паміж жанчын і дабраславёны плод улоньня Твайго, бо Ты нарадзіла Збаўцу душ нашых.

Пад Тваю міласьдь аддаём сябе, Багародзіца Дзева, малітвау нашых не адкінь у пакутах, але ад бедау збаў нас. Адзіна чыстая і дабраславёная, найсьвяцейшая Багародзіца, ратуй нас.

## ТРАПАР КРЫЖА ЗА НАРОД

Збаў, Госпадзе, людзей Тваіх і дабраслаў насьледзьдзе Тваё, перамогу праваслаўным хрысьціянам над супраціўнымі дай і Тваім Крыжам сьвятым ахоўвай жыхарства Тваё.

## МАЛІТВА ХВАЛЫ ДА НАЙСЬВЯЦЕЙШАЙ БАГАРОДЗІЦЫ

Дастойна і прабедна ёсьць славіць Цябе, Багародзіцу, заўсёды шчасьлівую і найчысьцейшую, і Маці Бога нашага, пачасьнейшую за херувімаў і без параўнаньня слаўнейшую за сэрафімаў, што



нарадзіла Бога Слова непарушаную, існую Багародзіцу Цябе праслаўляем.

## МАЛІТВА ЗА ЖЫВЫХ

Збаў, Госпадзе, і зьлітуйся над праваслаўнымі патрыярхамі, япіскапамі і ўсімі духоўнікамі, якіх Ты паставіў даглядаць агул Твой хрысьціянскі і малітвамі іхнымі зьлітуйся й ратуй мяне.

Збаў, Госпадзе, і зьлітуйся над айцом маім духоўным (імя) і сьвятымі малітвамі ягонымі выбач мне грахі мае. (паклон)

Збаў, Госпадзе, і зьлітуйся над бацькамі маімі (імёны), братамі й сёстрамі (імёны), і над усімі маймі роднымі й блізкімі і падай ім Тваю ласку: спакой, радсьць і дабро. (паклон)

Збаў, Госпадзе, і зьлітуйся над старымі й малымі,над беднымі сіротамі, удовамі, над тымі, хто ў хваробе,горы, бядзе й смутку



прабывае. І над тымі запраўднымі слугамі Тваімі, што за Цябе й за веру праваслаўную дзеля бязбожнікаў, адступнікаў і гэрэтыкаў у цямніцах, турмах прабываюць і пакутуюць. Памяні іх, Госпадзе, і наведай, і ўзмацні, і пацеш іх, і сілаю Тваёю хуткае вызваленьне й свабоду ім дай. ('паклон)

Збаў, Госпадзе, і зьлітуйся над тымі, хто ў далёкіх службах прабывае, падарожнічае; збаў бацькоў, братоў і сёстраў нашых і ўсіх праваслаўных хрысьціянаў. (паклон)

Збаў, Госпадзе, і зьлітуйся над тымі, хто ненавідзіць і крыўдзіць мяне і спрычыняе мне ўсякія прыкрасьці, і ня дай ім загінуць дзеля мяне грэшнага. (паклон)

Тых, што адыйшлі ад праваслаўнае веры і згубнымі гэрэзіямі засьлепленых, сьвятлом Твайго пазнаньня асьвятлі і да Тваёй Сьвятой Саборнай Апостальскай Царквы далучы. (паклон)



## МАЛІТВА ЗА ПАМЕРЛЫХ

Памяні, Госпадзе, душы супачылых слугаў Тваіх, бацькоў маіх (імёны) і ўсіх родных маіх і выбач ім усе грахі іхныя - сьвядомыя й несьвядомыя, прымі да Сябе ў валадарства вечнае славы Твае, бясконцага шчасьця і радасьці нявымоўнае навекі. (паклон)

Памяні, Госпадзе, усіх супачылых у надзеі на ўваскрасеньне й жыцьцё вечнае бацькоў, братоў і сёстраў маіх, тут і ўсюды пахаваных праваслаўных хрысьціянаў, супакой іх разам са сьвятымі Тваймі, дзе зьзяе сьвятло аблічча ТвайгоД памілуй нас, бо Ты добры й чалавекалюбны. Амін. (паклон)

Выбач, Госпадзе, грахі ўсім тым, што адыйшлі ў веры й надзеі на ўваскрасеньне бацьком, братом і сёстрам маім ,і ўчыні ім вечную памяць. Амін. (тройчы)

## ПАМЯЦЬ ПРА МАЦІ

Мама! Як міла гучыць гэтае цёплае слова, і мы сьхіляем прад Табой галовы. Я памятаю Цябе ў гэтую ўрачыстую гадзіну, мая Дарагая Маці.

Я ўспамінаю дні, калі Ты была з намі на зямлі і Сваёй чулай любоўю пільнавала нас, як анёлахоўнік. Колькі-ж разда сьвітанку над схварэлымі намі Ты сядзела й сачыла цень палёгкі ў нас ды вуснамі грэла й горача нас туліла.

Ты адыйшла ад нас, але сувязь, што лучыла нашыя душы, ніколі не парвецца. Адбітак Твайго вобразу жыве у нашых сэрцах.

Няхай шматлітасьцівы Айцец наш нябесны ўзнагародзіць Цябе, Дарагая Маці, за Тваю аддансьць, вернасьць і дабрыню, якія Ты мела для нас.Няхай ён аселіць душу Тваю разам з праведнікамі і падыме сьвятло Свайго аблічча над Табою і ўзнагародзіць Цябе вечным шчасьцем і спакоем. Амін.



## МАЛІТВА ДА СВАЙГО СЬВ. ІМЕНЬНІКА

Прасі Бога за мяне, сьвяты (-ая) ўгодніча (-ца) Божы (-ая) (імя), бо да Цябе я горача зьвяртаюся, як да хуткага (-ай) памочніка (-цы) і багамольца (-ніцы) за душу маю.

## МАЛІТВЫ НА ПРАЦЯГУ ДНЯ

## МАЛІТВА ПЕРАД ПАЧАТКАМ УСЯКАЕ ПРАЦЫ

Госпадзе Ісусе Хрысьце, адзінародны Сыне беспачатнага Твайго Айца, Ты сказаў Сваймі найсьвяцейшымі вуснамі: «Безь Мяне вы нічога ня можаце зрабіць». Госпадзе мой, Госпадзе, прыняўшы вераю гэтыя сьвятыя словы Твае ў сэрца й душу маю, я зварачаюся да Твае дабрыні і прашу Цябе: памажы мне грэшнаму ў гэтай маёй працы, што цяпер пачынаю,



як для Цябе Самога яе выканаць, у імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амін.

Альбо коратка: Госпадзе, дабраслаў.

## МАЛІТВА ПА ЗАКАНЧЭНЬНІ ПРАЦЫ

Ты ёсьць, Хрысьце мой, завяршэньне ўсіх добрых учынкаў, напоўні радасьцю і весялосьцю маю душу і збаў мяне, Ты адзіны многалітасьцівы. Амін.

Альбо коратка: Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

## МАЛІТВА ПЕРАД НАВУКАЮ

У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа.

Магутны Божа! Пашлі намласку Духа Твайго Сьвятога, які дае й мацуе нашыя душэўныя сілы, каб мы ўважна слухалі выкладаныя



нам навукі і расьлі Табе,Творцу нашаму, на славу, нашым бацьком і настаўнікам на радасьць, Царкве й Бацькаўшчыне нашай на дабро й славу. Амін.

Альбо:

Уладару нябесны, Уцяшыцелю, Духу ісьціны, што ўсюды прысутны і ўсё напаўняеш, Скарбніца дабра й Жыцьцядацелю, прыйдзі і ўсяліся ў нас і ачысьці нас ад усяго благога, і збаў, Добры, душы нашы.

## МАЛІТВА ПАСЬЛЯ НАВУКІ

У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа.

Дзякуем Табе, Стварыцелю, што ласкава дазволіў нам уважліва выслухаць навуку. Дабраслаў нашых кіраўнікоў, бацькоў і настаўнікаў, якія вядуць нас да пазнаньня дабра, і дай ім сілу і здатнасьць прадаўжаць гэтую навуку.Амін.

## МАЛІТВА КАЯНЬНЯ Й НАШЫХ ПРОСЬБАЎ ДА ГОСПАДА

Зьменш, пакінь, выбач, Божа, грахі нашы, умысныя і няўмысныя, якія мы ўчынілі словам ці справаю,сьвядома ці несьвядома, удзень ці ўначы, у думках ці ў намерах: усё нам выбач, бо Ты добры й чалавекалюбны.

Тым, хто нас ненавідзіць і крыўдзіць, выбач, Госпадзе ча лавекалюбны. Тым, хто дабро робіць, памнож іхнае дабро. Братом і сваяком нашым выбач, каб іхныя просьбы аб збаўленьні прывялі іх у жыцьцё вечнае. Хворых наведай і выздараві іх. Тымі, хто на моры, кіруй. З тымі, хто ў падарожжах, спадарожнічай. Хрысталюбным уладам памагай. Тым, хто нам памагае і нас любіць, грахі выбач. Тых, хто просіць нас памаліцца за іх, памілуй дзеля вялікае літасьці Твае. Памяні, Госпадзе. адыйшоўшых айцоў і братоў нашых і дай ім спакой у сьветласьці аблічча Твайго. Памяні, Госпадзе, братоў



нашых, што ў палоне, і вызваль іх ад усякае бяды. Памяні, Госпадзе, тых, хто прыносіць добры плод і дабро чыніць у Тваіх сьвятынях, выслухай іхныя про-сьбы аб збаўленьні і дай ім жыцьцё вечнае. Памяні, Госпадзе, і нас, пакорных, грэшных і нягодных слугаў Тваіх, і прасьвятлі наш розум сьвятлом мудрасьці Твае, і накіруй нас на шлях запаветаў Тваіх малітвамі найчысьцейшае Ўладаркі нашае Багародзіцы і ўвесь час Дзевы Марыі і ўсіх Тваіх сьвятых. Бо Ты дабраслаўлёны на вякі вякоў. Амін.

## МАЛІТВА ПЕРАД СПОВЕДЗЬДЗЮ

Госпадзе Божа наш, Ты не жадаеш сьмерці грэшніка, але хочаш, каб ён вярнуўся да Цябе і належна жыў. Зьвяртаюся і я да Цябе, мой Божа: прымі маё каяньне, пашлі майму сэрцу зразуменьне



віны, узруш маё сумленьне, каб мая споведзь была нрад Табою шчырая й праўдзівая, і дай мне цьвёрдую волю для моцнае пастановы весьці жыцьцё маё шляхам справядлівасьці й годнасьці, праслаўляць на кожным кроку майго жыцьця сьвятое імя Тваё, Айца,і Сына,і Сьвятога Духа, цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.

## МАЛІТВА КАЯНЬНЯ

Вызнаю Табе, Госпаду Богу майму і Творцу ў Сьвятой Тройцы адзінаму, годнаму славы й пакланеньня Айцу,і Сыну, і Сьвятому Духу, усе мае грахі, што ўчыніў я за сваё жыцьцё, у кожную часіну і ў цяперашнім часе ўчынкам, словам, думкаю, зрокам, слыхам, нюхам, смакам, вошчупам і ўсімі маймі пачуцьцямі душэўнымі й

шкадую, нрызнаю сяое вшаватым прад Табою, Божа мой, і маю волю да каяньня. Сьлёзна й пакорна прашу Цябе, Госпадзе Божа мой: памажы мне і выбач Тваім міласэрдзем учыненыя мною грахі й правіны і ратуй мяне ад іх усіх, бо Ты добры й чалавекаюбны. Амін.





## МАЛІТВА ПЕРАД СЬВ. ПРЫЧАСЫДЕМ

Знаю, Госпадзе, што калі нягодна прыйму найсьвяцейшае Цела Тваё і дарагацэнную Кроў Тваю, то буду вінаватым, спажыву сабе на засуджэньне, без належнае развагі пра Цела й Кроў ды Цябе, Хрыста й Бога майго. Але спадзяюся на Тваё міласэрдзе, прыходжу да Цябе, Які сказаў: «Хто спажывае Цела Маё і п'е Кроў Маю, той ува мне прабывае, і Я ў ім». Таму зьлітуйся, Госпадзе, і не засудзі мяне грэшнага, але ўчыні са мною паводле міласьці Тваё: і няхай будуць мне гэтыя Сьвятасьці на выздараўленьне, і ачышчэньне, і асьвятленьне, і ахаваньне, і збаўленьне, і на асьвячаньне душы й цела, на разьвеяньне ўсякіх благіх мрояў і ўплыву нячыстага, што, думкаю прыхаваны, дзее ў маім целе. Няхай будуць на спадзяваньне й любоў да Цябе: на паправу і ўмацаваньне жыцьця, на рост цнотаў і дасканаласьці, на выка-



наньне Тваіх запаветаў, на супольнасьць з Духам Сьвятым, успамогай да жыцьця вечнага, на добры адказ на страшным судзе Тваім, а ніколі ня будуць мне ў суд ці засуджэньне. Амін.

## МАЛІТВА ПЕРАД САМЫМ СЬВ. ПРЫЧАСЬЦЕМ

Верую, Госпадзе, і вызнаю, што Ты праўдзівы Хрыстос, Сын Бога жывога, Які прыйшоў на сьвет збавіць грэшных, між якіх я першьт. Яшчэ верую, што гэта найчысьцейшае Цела Тваё, і гэта самая дарагацэнная Кроў Твая. Таму прашу Цябе: зьлітуйся нада мною і выбач грахі мае ўмысныя й няўмысныя,ці то словам, ці ўчынкам, сьвядомыя й несьвядомыя; і ўдастой мяне неасудна прычасьціцца найчысьцейшых Тваіх Тайнаў на выбачэньне грахоў і на жыцьцё вечнае. Амін.

Вячэры Твае Тайнае сёньня, Сыне Божы, удзельнікам мяне прый-



мі: ворагам бо Тваім тайны не скажу і цалаваньня Табе ня дам, як Юда, але, як разбойнік, вызнаю Цябе: успомні мяне, Госпадзе, у валадарстве Тваім.

Няхай ні на суд, ані на засуджэньне ня будзе мне прычашчэньне сьвятых Тваіх Тайнаў, Госпадзе, але на выздараўленьне душы й цела.

Божа, будзь літасьцівы да мяне грэшнага. (тройчы)

## МАЛІТВА ПАСЬЛЯ СЬВ. ПРЫЧАСЬЦЯ

Слава Табе, Божа, слава Табе! (тройчы)

Дзякую Табе, Госпадзе Божа мой, што не адкінуў Ты мяне грэшнага, але дазволіў мне быць удзельнікам Тваіх Сьвятасьцяў. Дзякую Табе, што ўдастоіў мяне, нявартага прычасьціцца найчысьцейшае Твае нябеснае ахвяры. Айце, Уладару чалавекалюбны, што дзеля нас

памёр і ўваскрос, і даў нам страшныя й жыцьцятворчыя Таінствы на дабро й асьвячаньне душы й цела, на разьвеяньне ўсяго супраціунага, на прасьвятленьне вачэй сэрца майго, на спакой маіх душэўных сілаў, на неасудную веру, на любоў некрывадушную, на паўнату мудрасьці, на выкананьне запаветаў Тваіх, на павялічэньне Боскае ласкі валадарства, каб, усім гэтым у сьвятыні Тваёй захаваны, я памятаў заўсёды ласку Тваю і ўжо ня дзеля сябе жыў, а дзеля Цябе, нашага Ўладара й Дабрачынца. І, гэтае жыцьцё пакінуўшы у надзеі на жыцьцё вечнае, асягну навекі супакой, дзе голас сьвяткуючых бязупынны і бясконцая асалода тых, хто бачыць нявымоўную к р а с у аблічча Твайго. Бо Ты ёсьць праўдзівае жаданьне й бязьмежная радасьць тых, хто любіць Цябе, Хрысьце Божа наш, і ўсякае стварэньне пяе хвалу Табе навекі. Амін.



## МАЛІТВА СЬВ. ВАСІЛЯ ВЯЛІКАГА ПАСЬЛЯ ПРЫЧАСЬЦЯ

Госпадзе Хрысьце Божа, Уладару вякоў і Творца ўсяго! Дзякую Табе за ўсё добрае, што Ты даў мне, і за прычашчэньне, Тваіх найчысьцейшых і жыцьцятворчых Тайнаў. І прашу Цябе, Добры й Чалавекалюбны: ахавай мяне пад покрывам Тваім і пад апекай крыльля Твайго і дай мне да апошняга дыху майго з чыстым сумленьнем прычашчацца Сьвятасьцяў Тваіх на выбачэньне грахоў і на жыцьцё вечнае. Бо Ты - Хлеб Жыцьця, Крыніца сьвятасьці, Падаўца дабра, і Табе славу аддаём, з Айцом і Сьвятым Духам, цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.

## МАЛІТВА ПАДЗЯКІ СЬВ. АМБРОЗІЯ

Цябе Бога славім, Цябе Госпада ўсхваляем, Цябе спрадвечнага Айца ўся зямля праслаўляе. Табе



ўсе анёлы, Табе нябёсы і ўсе сілы, Табе херувімы й сэрафімы бязупынна пяюць: сьвяты, сьвяты Госпад сілаў, поўныя неба й зямля велічнае славы Твае.

Цябе найслаўнейшы апостальскі сабор. Цябе хвальнае прарочае войска пакутнікаў, Цябе па ўсім сьвеце сьвятая Царква праслаўляюць, як Айца няпрыступнае велічы, і супакланяльнага Твайго праўдзівага й адзінароднага Сына і Сьвятога Духа-Пацяшыцеля.

Ты Ўладар славы, Хрысьце. Ты Сын вечнаіснага Айца. Ты дзеля нашага збаўленьня стаўся чалавекам, не пагрэбаваў улоньнем Дзевы. Ты джала сьмерці скрышыў, веруючым нябеснае валадарства адчыніў.

Ты ў славе Айцоўскай праваруч Бога сядзіш і верным як Судзьдзя прыйдзеш. Таму просім Цябе: памажы слугам Тваім, якіх Ты дарагацэннай Крывёю выкупіў. Дазволь нам са сьвятымі Тваймі ў славе вечнай Тваёй пасад мець. Збаў, Госпадзе, людзей Тваіх і дабраслаў насьледзьдзе Тваё, кіруй імі і ўслаў іх навекі.



Усе дні дабраславім Цябе і хвалім імя Тваё бязупынна й на вякі вякоў. Дазволь, Госпадзе, у гэты дзень бяз грэху застацца нам.

Зьлітуйся над намі, Госпадзе, зьлітуйся над намі. Няхай будзе міласьць Твая на нас, бо мы спадзяёмся на Цябе. На Цябе, Госпадзе, маем надзею, і не засаромімся навекі. Амін.

## МАЛІТВА НА ЧУЖЫНЕ ДА БОЖАЙ МАЦІ ЖЫРОВІЦКАЙ

Найсьвяцейшая Дзева Марыя, нашая добрая Маці і Ўладарка, выслухай нашую просьбу, скараці дні н а ш а е нядолі й зьдзеку! Нашыя цярпеньні, боль душы й бяду прыймі. Памажы нам перанесьці гэты жыцьцёвы крыж выгнаньня.

Прасі Сына Свайго, Госпада нашага Ісуса Хрыста, каб паслаў нам радасьць аглядаць сваймі вачыма вольную бацькаўшчыну на-

шу Беларусь, жыць у ёй і працаваць Богу на славу.

Бо-ж Ты адзіна чыстая і ўседабраславёная Багародзіца, Дзева Марыя, Уладарка Беларусі, што сьвеціш у Жыровічах цяпер і на вякі вякоў. Амін.






## МАЛІТВА ДА БОЖАЙ МАЦІ ЖЫРОВІЦКАЙ

О, Маці, што закрасавала
Свайму народу не ў цьвярдыні,
Акрытай славаю нязьвялай,
А на грушцы ў пушчы сіняй,
Ты, што успыхнула зарніцай
Не ўладаром зямным узвышшаў,
А пастушком малым і ніцым, -
Будзь Апякункаю ўсяможнай
І тых, што гінуць на Радзіме,
І тых, што торбы падарожнай,
Жабрачай з плеч ніяк ня здымуць.
Дай, каб нам гарт у ўсіх дастоіў,
Дай, каб мы верылі, як дзеці,
Дай, каб імя Тваё сьвятое
Пранесьлі зь вераю па сьвеце,
Дай, каб злаба, мана, зацятасьць
Нам ня былі ў жыцьці спакусай...
...Вярні нам нівы нашы й хаты,
О, Матка Божа Беларусі!





## МАЛІТВА НА ЧУЖЫНЕ ДА СЬВ. ЕЎФРАСІНЬНІ

О, сьвятая й слаўная апякунка й асьветніца Беларускага народу, маці нашая Еуфрасіньня! Глянь ласкавым вокам сваім на братоў і сёстраў тваіх,што зь любоўю й надзеяй вочы душаў сваіх да цябе падымаюць. Ты не асудзіла нас, што мы ў няволі сваёй доўгі час не маглі славіць у сьвятынях сваіх сьвятога імені твайго. Бо мы ведаем,што гэта ты сьвятымі малітвамі сваймі выпрасіла нам ласку Збаўцы нашага, і мы цяпер у сьвятых цэрквах сваіх можам аддаваць хвалу Трыадзінаму Богу й табе. апякунцы нашай. Таму і ўдзячныя сэрцы нашы, поўныя любові й падзякі да цябе, у захапленьні сьпяваюць: Радуйся!

Радуйся, заступніца, апякунка й малельніца наша! Радуйся, радаваньне Полацкай і ўсёй зямлі на-

бае Беларусі нашае! Радуйся, пашыральніца дабра, праўды, красы й згоды у краіне нашай! Радуйся, памочніца пакрыўджаных, сумных пацяшэньне! Радуйся, удоваў і сіротаў заступніца! Радуйся, кветка з райскага саду нясьмягнучая! Радуйся, у веры нашай на выгнаньні і ў пакутах падтрыманьне! Радуйся, хворых і паміраючых пацеха й выздараўленьне! Радуйся, да магілы Хрыстовай зь сьвятымі духмянасьцямі прыходзячая! Радуйся, усё Хрысту ахвяраваўшая! Радуйся, сьвятых угоднікаў Божых краіны нашае зьзяньне, веліч і слава! Радуйся, сьвятая маці нашая, Еўфрасіньня!

Прыймі, заступніца нашая, гэтую малітву братоў і сёстраў тваіх, як нашую нявымоўную падзяку, любоў і хвалу табе - надзея, слава й пацеха наша! Усе мы з радасьцю аддаём сябе пад сьвятую апеку тваю. Маліся й далей за шматпакутны народ наш перад пасадам Усявышняга, каб мы сталіся верным і набожным, выбраным на-



родам Ягоным! Каб ён Духам Сваім Сьвятым узмацняў і прасьвятляў душы й сэрцы нашых пастыраў і правадыроў, пацяшаў і радаваў нашых удоваў і сіротаў, а ўсім нам паслаў спакой і радасьць на чужыне і прывёў нас на вольную зямельку нашу, каб мы ўсе разам там маглі славіць цябе і пяяць хвалу Яму, Збаўцу нашаму, ды цешыцца й радавацца ў валадарстве славы Ягонай на вякі вякоў. Амін.

## МАЛІТВА ДА СЬВ. КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА

Сьвяты Кірыле, любы браце наш, ты бяздоннае мора духовага багацьця й красы Божае! Ты вобраз духовае велічы нашых пабожных прашчураў! Ты люстра дабрыні іхнае! Ты нашыя анёльскія вусны на небе! Ты нашыя духовыя арлíныя крылы да раю! Ты жывая вада Госпадава! Ты знак нашае любові прад пасадам Божым, на-



шая надзея на Яго! Ты нага хадайнік прад справядлівым Судзьдзём! Ты наш беларускі каштоўны дыямант у кароне найбольшых сьвятых! Ты нашая зьзяючая слава Божая, бліскучы розум нашага народу, нашая сьвятасьць, і нашая радасьць навекі.

Сьвяты Кірыле, любы браце наш, прасі Бога за нас! Амін.





## МАЛІТВА ЗА БАЦЬКОЎ І РОДНЫХ

Усяшчодры Ойча, Ты ў Сваёй дабраце памятаеш пра ўсе стварэньні; Твая бацькаўская рука апякуецца ўсім. Ты дбаеш і пра гняздо кожнае птушкі з птушанятамі, і нішто ў сьвеце ня дзеецца без Твайго ведама. Пасылаючы Свайго адзінароднага Сына на гэты сьвет, Ты выбраў і апякуна для Ягонае Маці, асьвячаючы такім чынам сям'ю. Нябесны Ойча, прашу Цябе, дабраслау маю радню, як дабраславіў Ты сьвятую сям'ю ў Назарэце. Глянь Сваім ласкавым вокам на маіх бацькоў, мацуй сілы іхнае душы й цела, асьвяці іх Тваёю сьвятою ласкаю, дабраслаў працу іх рук, гарачую рупнасьць і пот іхны, пашлі Твайго анёла, няхай ахоўвае іх ад ўсякіх ворагаў скрытых і яўных, ад усякае бяды, гора, суму, немачы цела й душы, ды захавай іх нам, дзецям, у спакоі, славе й здароўі,

каб вучылі нас слоў Твае праўды. А Цябе, адзінародны Сыне Божы, прашу: Ты, што быў паслушны Свайму нябеснаму Айцу ўва ўсім, учыні, каб і мы, дзеці, былі падобныя у гэтым послуху да Цябе, ад Цябе бралі прыклад паслухмянасьці нябеснаму Айцу й зямным бацькам, каб гэткім чынам хоць часткова адудзячыліся ім за працу, якую нясуць для нас, ды аблегчылі яе ім, каб асаладзіць горкасьць жыцьця на гэтым сьвеце ды садзейнічаць у асягненьні кароны нагароды ў вечнасьці. Духу Сьвяты, усюды прысутны і ўсё напаўняючы, скарбніца ўсіх дабрадзействаў і ласкаў, прыйдзі й жыві між нас; няхай наша хата будзе Табе сьвятыняю, сашлі на нас Твае сьвятыя дары, няхай плён Твой будзе відавочны ў нашай сям'і, няхай усіх нас яднае любоў і пануе нябесная радасьць ды Божы спакой. Бо-ж Ты Валадар спакою й любові, дык дазволь-жа, каб мы славілі Цябе, Найсьвяцейшая



Тройца Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.

## МАЛІТВА СІРАТЫ

Нябесны мой Ойча й міласэрны Госпадзе! Да Цябе зьвяртаюся, як да адзінага Пацяшыцеля ўсіх засмучаных і абяздоленых, і з гарачымі сьлязьмі прашу Цябе ў маім сіроцтве: не забудзь мяне бедную сірату. У Твае рукі аддаю долю ўсяго майго жыцьця. Мацуй-жа мяне ў веры, надзеі й любові, і дапамажы Тваімі ласкамі вытрываць у добрым аж да сьмерці. А маё сэрца, нябесны Ойча, напоўні цярплівасьцю ды пацехаю, калі нястача й гора насылацімуць на мяне чорную роспач. Сэрцы маіх бліжніх пабудзі да літасьці й помачы ў адносінах да мяне і дабраслаў усіх тых, што памагаюць мне й асалоджваюць маё сірочае жыцьцё. Узнагарадзі іх Тваймі нябеснымі й зямнымі дарамі. А памер-



лым маім оацьком дай вечнае шчасьце ў Тваім валадарстве. Амін.

## МАЛІТВА БАЦЬКОЎ ЗА ДЗЯЦЕЙ

Госпадзе, Божа наш, Ты дабраславіў нашае сужэнства дзяцьмі ды паставіў нас настаўнікамі й праваднікамі іхнымі; Ты аддаў пад апеку нашу вінаграднік Свой. які мы маем даглядаць. Дзеля гэтага просім Цябе, Госпадзе. дай нам чысты розум і волю непахісную. каб мы маглі рассудна й належна выхаваць іх на годных людзей і справядлівых слугаў Тваіх. Дабраслаў, Ойча нябесны, дзетак нашых, пашлі добрую волю ў сэрцы іхныя, добрыя жаданьні й намеры, любоў да ўсяго, што разумнае, праведнае й сьвятое. Ахавай іх Тваёй сьвятой ласкай, а мы будзем славіць Цябе ўва ўсе дні жыцьця нашага. Амін.

## ПЕСЬНЯДЗІЦЯТКІ

О, анёле, дружа мой!
Ты заўсёды пры мне стой,
Зраньня, ўвечар і ўначы
Будзь ласкавы памагчы:
Верна мне служыці Богу,
Каб адолець духа злога,
Ды любіці маму, тату,
Родны край і нашу хату.

## МАЛІТВА МАЛАДОГА ЧАЛАВЕКА

Ойча мой нябесны, цяпер я іду гэткім жыцьцёвым шляхам, дзе так шмат спакусаў, так лёгка можна ўпасьці ў грэх, так хутка можна заблудзіць у тых дарогах жыцьця, якія яшчэ ляжаць перада мною. Прашу Цябе, вартуй мяне праз Свайго анёла-праўдніка, ня дай мне ўпасьці, ня дай заблудзіцца, ня дай згубіць прад вачамі Твой шлях ратунку. Сам, Госпадзе, будзь мне правадыром і пашлі мне добрых дараднікаў, пабожных і

чэсных сяброў ды сумленных настаўнікаў, каб мы ўсе супольна, цяпер і навекі славілі найсьвяцейшае імя Тваё, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амін.

## МАЛІТВА ПАДАРОЖНІКА

Калі апосталы Твае, Ісусе Хрысьце, былі на моры падчас навальніцы, Ты прыйшоў да іх, кажучы: "Ня бойцеся!", і бура прыціхла, і Ты спакойна прывёў іх да берагу.

Так, ГоспадзеД мяне ахоўвай падчас майго падарожжа; будзь мне памочнікам і вартаўніком прад усякай небясьпекай; памагай мне ў цяжкасьцях і ахоўвай ад усякага ліха, што можа мяне спаткаць.

Аддаю сябе пад Тваю ахову, і Ты давядзі мяне да шчасьлівага канца ў маім падарожжы.

На Тваю дапамогу я спадзяюся і ўвесь час вочы мае будуць да Цябе зьвернены. У часе небясьпекі ратуй мяне й давядзі да спакойнага месца майго прабываньня.



## МАЛІТВА ЦЯЖАРНАЕ

О, найсьвяцейшая Маці Божая! Зьлітуйся нада мною, Тваёю служкаю: прыйдзі мне на помач у маім цяперашнім палажэньні і ў тых небясьпеках, сярод якіх родзяць дзяцей усе бедныя дочкі Евы. Успомні, о, дабраславёная сярод жанчын, зь якою радасьцю й любоўю Ты сьпяшалася наведаць Сваю сваячку Альжбету ў часе яе цяжарнасьці і як цудоўна падзеялі на маці й дзіцятка Твае ласкі поўныя адведзіны. У бясконцай дабрыні Тваёй памажы і мне, пакорнай слузе Тваёй, у спакоі й радасьці нарадзіць дзіцятка. Дай і мне гэтую Тваю ласку, каб дзіцянятка ўва ўлоньні маім, адчуўшы яе, таксама радасна ўзварушылася, падобна да сьвятога дзіцятка Яна, і пакланілася Госпаду Богу й Збаўцу нашаму, Які зь любові да нас грэшных не палічыў Сабе паніжэньнем Самому стаць дзіцяткам. Нявымоўная радасьць, якою напоўніла сэрца Тваё, Дзева, калі



Ты глянула на нованароджанага Твайго Сына й Госпада,няхай асалодзіць мае цярпеньні у часе нараджэньня майго дзіцятка. Жыцьцё сьвету, Збаўца мой, народжаны Табою, няхай ратуе мяне ад цярпеньня, што здараецца сярод мацярок у часе родаў, і няхай залічыць ён плод улоньня майго да ліку абраных Богам. Выслухай, найсьвяцейшая Заступніца, Уладарка нябесная, гэтую малітву маю і глянь на мяне грэшную вокам ласкі Свае.Не засаром мяне ў надзеі на Тваё вялікае міласэрдзе, і ахіні пакровам Тваім. Памоч-ніца хрысьціян, лекарка хворых, памажы мне, каб і я пазнала на сабе, што Ты - Маці міласэрдзя, і каб я заўсёды славіла Тваю дабрыню, якая заўсёды прыймае малітвы тых, хто церпіць і сьпяшаецца да Цябе з просьбамі ў сваіх бедах і хваробах. Амін.



## МАЛІТВА Ў НЯШЧАСЬЦІ

Усемагутны Божа, без Твае веды й волі нават волас з галавы не спадзе, маё няшчасьце сталася з Твайго сьвятога допусту. Ня ведаю,Ойча мой, я Тваіх плянаў, хоць і ведаю, што ўсё Ты мне на карысьць робіш, але цяжка несьці мне гэты крыж цярпеньня, дык Цябе многалітасьцівага Айца прашу: аблягчы мне маё цярпеньне, злагодзь мой боль. Ты, Госпадзе Ісусе Хрысьце Збаўца наш, калісь Сам падаў, нясучы крыж на Галготу. а цяпер я да ног Тваіх прыпадаю і палёгкі цярпеньня майго ў Цябе прашу. Знаю, Госпадзе, што справядліва Ты мяне караеш, бо хто зь людзей бяз грэху? А я з грэшнікаў найгоршы (-ая). Ці раз, Госпадзе, у спакойным жыцьці пра Цябе забываўся (-лася). Волю Тваю сьвятую не ўважыў(-ла), так як Ты загадаў, добрых учынкаў не рабіў (-ла). Але Ты ўсёлітасьцівы, выбач мне *ўсё* гэта паводле Твайго бясконцага міласэрдзя і дай мне

на прышласьць ахвоту й сілу жыць паводле Тваіх запаветаў і выконваць Тваю сьвятую волю. Выслухай мяне, нябесны Ойча, зьлітуйся нада мною, суцеш мяне, бо Ты - Бог, што мілуе і ратуе, і Табе славу аддаём, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.

## МАЛІТВА ХВОРАГА

Госпадзе Божа,Уладару жыцьця майго! Ты з ласкі Свае сказаў «Не хачу сьмерці грэшніка», каб ён пазнаў Цябе і жывы быў. Я ведаю, што гэтая хвароба, якая прыносіць цярпеньні мне, гэта - кара Твая за грахі й правіны мае. Я знаю, што ўчынкамі сваймі заслужыў гэтую Тваю справядлівую заплату. Але, чалавекалюбны Госпадзе, будзь літасьцівы да мяне грэшнага: судзі мяне не паводле ліхіх учынкаў маіх, а паводле бязьмежнага міласэрдзя Твайго. Не пасылай сьмерці на мяне, але дай мне сілы, каб я цярпліва перанёс гэтую хваробу



сваю, як заслужанае мною выпрабаваньне, і па ачуняньні ад яе,каб зьвярнуўся ўсім сэрцам, усёю душою і ўсім разуменьнем сваім да Цябе, Госпада Бога, Творцы майго, і жыў дзеля выкананьня запаветаў Тваіх сьвятых на славу Табе, на радасьць маіх родных і на маё дабро. Амін.

## МАЛІТВА ЗА ХВОРАГА

Ісусе Хрысьце, Божа наш! Калі хворая жанчына зь вялікай верау дакранулася да краю вопраткі Твае, яна ачуняла. Паводле веры ейнай Ты аздаравіў яе.

З гэткаю-ж вераю і я зьвяртаюся да Цябе, Лекару ўсіх, памажы слугу Твайму (слузе Тваёй) івылечы хваробу яго (яе). Дай яму (ёй) душэўны спакой і цялесную сілу. Дабраслаў яго (яе) ціхім сном бяз болю й падымі яго (яе) з пасьцелі здаровым (-ай).

Ласка Твая, Госпадзе, няхай будзе над намі, бо мы спадзяёмся на Цябе. Амін.



## МАЛІТВА НА ВЫЗДАРАЎЛЕНЬНЕ ХВОРАГА

Міласэрны Божа - Ойча, Сыне, і Духу Сьвяты,Тройца Сьвятая, - годны хвалы й славы! Глянь з ласкі Свае на слугу Твайго (імя хворага/-ае)! Выбач яму (ёй) грахі й правіны ягоныя (ейныя), вызвалі ад хваробы, вярні яму (ёй) здароўе й сілы. Дай яму (ёй) даўгое й спакойнае жыцьцё, абдары яго (яе) ўсякім Тваім Боскім дабром, каб ён (яна) разам з намі чыніў (-ла) малітвы падзякі Табе, шчодраму Богу й Тварцу нашаму. Найсьвяцейшая Багародзіца, усемагутным заступніцтвам Тваім памажы мне ў гэтай малітве маёй упрасіць Сына Твайго, Бога майго, каб ён памог ачуняць слугу (слузе) Божаму(-ай) (імя).

Усе анёлы Госпадавы і ўсе сьвятыя, прасеце Бога, каб ён памог і ачуняў(-ла) слуга Ягоны (Ягоная) (імя).



## ПАРУЧЭНЬНЕ СЯБЕ Ў АПЕКУ НАЙЧЫСЬЦЕЙШАЙ ДЗЕВЕ МАРЫІ

Найчысьцейшая Дзева, Маці Божая, выбіраю Цябе вось цяпер сабе за заступніцу й маці. Шчыра прыракаю і моцна пастанаўляю ніколі Цябе не выракацца і нічога супроць Твае славы не казаць, не рабіць. Прашу Цябе, прымі мяне сёньня за слугу Свайго (-ю) на ўсю вечнасьць; памагай мне ў маёй працы й не пакідай мяне ні на часіну ні ў гэтым жыцьці, ні падчас сьмерці, але будзь пры мне ўвесь час і ў валадарства нябеснае мяне завядзі. Амін.

## МАЛІТВА ЗА ПАЛЕГЛЫХ НА ВАЙНЕ

Госпадзе Ісусе Хрысьце, Божа наш, Ты сказаў:«Няма большае любові, як палажыць душу сваю за сяброў сваіх», і Сам даў прыклад гэтае ўсеахвярнае любові; просім

Цябе, глянь ласкавым вокам Тваім на тую вялікую любоў загінуўшых гэрояў,што скрозь па ўсёй Беларусі і далёка за ейнымі межамі ў вядомых і невядомых, памятаных і забытых магілах, супачылых бацькоў,братоў,родных і блізкіх, тых, што палі ў баёх, загінулі ў турмах ці зьгібелі на ссылцы ў карных лягерох ці ў псыхтурмах. Злучы іхную крывавую ахвяру з Сваёю крыжоваю. Няхай ня будзе дарэмнай тая ахвяра, і няхай на залітай іхнаю крывёю зямлі закрасуе братняя любоў і сьвеціць сонца волі і шчаснай долі народу. А іх самых залічы, Госпадзе, у лік сваіх шчасьлівых слугаў. Яны цярпліва прайшлі цярністы шлях жыцьця і сваёю сьмерцяй далі сапраўднае пасьветчаньне сьвятасьці Твайго найбольшага запавету - любові. Не адкінь гэнай іхнай ахвяры, а прымі яе, як прыняў ахвяру праведнага Авэля, і дзеля гэтае ахвяры ды паводле Свае вялікае міласэрнасьці выбач ім грэшным правіны, наўмысныя



й ненаўмысмыя, ды супакой душы іх у вечнай славе Тваёй, дзе спачываюць усе сьвятыя. Няхай цешацца шчасьлівым аглядань-нем Цябе празь вякі вечныя. Амін.

## МАЛІТВА ЗА БЕЛАРУСКІ НАРОД

Уладару неба й зямлі, спрад-вечны Божа! Ласка Твая да нябёсаў, а праўда над воблакі! Ты ўвесь сьвет стварыў і Духам Сьвятым усё прасьвятляеш, ажыўляеш і мацуеш. А людзкі род так палюбіў, што Свайго Сына адзінароднага на зямлю паслаў, каб усе, што ўвераць у Яго, сталі дзяцьмі Тваймі, удзельнікамі Твайго нябеснага валадарства.

Мы, дзеці Беларускага Народу, стараліся выконваць волю Тваю й запаветы Твае;у шчырай пакоры просім Цябе: выбач нам сьвядомыя й несьвядомыя правіны нашы. Ратуй нас ад усялякіх спакусаў, пашлі нам еднасьць, згоду й пара



зуменьне. Умацуй Сьвятым Духам Тваім зьняволеных братоў і сёстраў нашых - працай абцяжаных і тых, хто на ссылках і ў турмах пакутуе.

Дабраслаў нашае сьвятарства і адабры працу сялянства, работнікаў, настаўнікаў, пісьменьнікаў, мастакоў і вучоных, каб наш народ мог разумна й добра жыць і Цябе, Айца нашага нябеснага, увесь час славіць.

Асьвятлі наш розум Тваім евангельскім сьвятлом, каб мы, як анёлы нябесныя, заўсёды былі з Табою.Пашлі Беларускаму Народу слугаў Сваіх, якія пабожным жыцьцём і дзейнасьцю вялі-б наш народ да лепшае долі.

Пашлі нам, Госпадзе, дар Духа Сьвятога, каб мы сталіся народам сьвятым і сваё пасланства выканалі, і Табе, спрадвечнаму Ўладару й Богу нашаму, у Сьвятой Тройцы адзінаму, вернасьць, падзяку, любоў і славу аддавалі - Богу Айцу, і Богу Сыну, і Богу Духу Сьвятому, цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.





## МАЛІТВА ЗА БЕЛАРУСЬ

У імя Айда, і Сына, і Сьвятога Духа. Амінь.

Божа ўсемагутні, адхіні напасьці ад Бацькаушчыны нашай Беларусі, захавай на вякі вечныя край вольным, зямлю плоднай, як маці вагітная, паветра чыстым, ваду здаровай, нетры непарушанымі, каб цешылася з ласкі Тваёй усё жывое: і чалавек, і птушка, і жывёліна, і рыба, і малая кузурка.

Ойча Нябесны, дабрвслау люд беларускі як у краю, так і далёка паза яго межамі. Захавай ад варожага ўціску, вайны, голаду, мору, агню пядельнага, патопу, д'ябальскай сілы чарнобыльскай, а так-жа ад брацкай нязгоды.

Дабраслаў на еднасьць і ўзаемадапамогу люд беларускі ў кожным месцы зямлі Тваёй, накіруй на шлях дабра і справядлівасьці, спагады да бліжніх і далёкіх нашых.

Памажы нам захаваць у сэрцах веру нашу і славіць Сьвятое імя Тваё на сьвятой мове нашай роднай беларускай.



Дай спазнаць літасьць Тваю, выбач нам грахі нашыя: злабу і гультайства, распусту і хцівасьць, а роўна-ж і абыякавасьць да лёсу Беларусі і да гора людзкога. Адвядзі нас ад спакусы здрады і явернасьці, крывой прысягі, слоў аблудных і іншых учынкаў, што губяць душы нашы і нясуць сорам Краю нашаму. Сьцеражы нас, Божа, ад грэху халуйства, ад прыніжэньня годнасьці Бацькаўшыны і нашаму народу беларускаму.

Не карай нас бяспамяцтвам і ня дай забыцца сьвятой мовы нашай беларускай, гісторыі, і трдыцыяў нашых, а дай сілы і шчырасьці з адданай любоўю і пашанаю прымнажаць спрадвечнае і высакароднае, што страрылі да нас продкі нашы.

Божа магутны. Божа літасьцівы, пашлі нам сілы і цярпеньня ў стараньнях нашых аб росквіце і волі Бацькаўшчыны нашай і дай нам бязмерную любоў, каб мы бясконца любілі сьвятую Беларусь, і захавай яе нам на векі вечныя. Амінь.



## МАЛІТВА НА ДАБРАСЛАВЕНЬНЕ

Госпадзе Сьвяты, што жывеш у вышынях і ўсябачным вокам Тваім глядзіш на ўсякае стварэньне. Мы сьхіляем прад Табою галовы і просім Цябе, Сьвяты Сьвятых, працягні Тваю нябачную руку са сьвятога Твайго пасаду і дабраслаў усіх нас; і калі мы ў чым зграшылі дабраахвотна ці недабраахвотна, Ты, як добры й чалавекалюбны Бог, выбач і дай нам Твае зямныя й нябесныя багацьці. Ты-ж бо Той, Хто мілуе і ратуе, Божа наш, і Табе славу аддаём, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і Ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.

## МАЛІТВА ЗА ЎСІХ І ЗА ЎСЁ

Выбач, Госпадзе міласэрны, тым, што нас крыўдзяць; тым, што робяць дабро, дабром адплаці. Братом і ўсім суродзічам нашым дай задавальненьне ўсіх просьбаў аб ратунку й жыцьці вечным. Навядай і аздараві немачных і хворых; для тых, што на моры, будзь правадніком; падарожным будзь спадарожнікам. Успомні, Госпадзе, зьняволеных братоў нашых, аднаверцаў праваслаўнае веры, і вызваль іх ад усякага няшчасьця. Памілуй, Госпадзе, тых, што служаць нам і любяць нас, і дай ім усё, што яны просяць для ратунку й жыцьця вечнага. Успомні, Госпадзе, памерлых бацькоў і братоў нашых і ўсіх, якія ў праўдзівай веры скончылі жыцьцё, і ашчасьліў іх зьзяючым сьвятлом віду Твайго. Глянь, Госпадзе, на немач і лютасьць нашу ды прасьвяці наш розум сьвятлом разуменьня Твайго Сьвятога Евангельля, і накіруй нас на шлях прыказаньняў Тваіх дзеля малітваў найчысьцейшае Твае Маці і ўсіх сьвятых. Амін.

## МАЛІТВА НА ЎСЯКУЮ ПАТРЭБУ

Дабраслаўёны Ты, Госпадзе Божа ўсеўладарны, што знаеш людзкія душы, знаеш чаго мы патрабуем, і

шмат больш даеш, чым мы просім і разумеем. Сам, любячы нас Уладару, ува ўсім добры, задавольні нас багацьцем ласкаў Тваіх, каб мы неасаромленым сумленьнем прызывалі сьвятое імя Тваё, і ня дай нас у спакусу, але ратуй нас ад злога,і провадам Тваім уладзь усё на нашу карысьць. Бо Табе належыцца ўсякая слава, чэсьць і паклон - Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.

## АПОШНЯЯ МАЛІТВА ПЕРАД СЬМЕРЦЮ

Пакорную душу маю адведай, міласэрны Госпадзе. У грэху ўсё жыцьцё маё правёў. Але, як Ты прыняў блудніцу, прымі, ратуй і мяне. Пераплываю ўжо бяздоньне гэтага жыцьця і думаю пра безьліч зла і грахоў маіх, і, ня маючы ніякага апраўданьня й ніякае іншае помачы, усклікаю разам зь Пётрам да Цябе:«Ратуй мяне, Хрысьце! Ратуй мяне, Божа, бо Ты добры й чалавекалюбны!»



Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому духу.

Хутка ўвойдзем у валадарства Хрыстовае, і ўсе пачуем дабраславёны голас Хрыста Бога: «Прыйдзеце ўсе, што любяць нябесную славу, што былі разам з мудрымі дзевамі, якія мелі запаленыя сьвечкі свае алеем веры».

І цяпер і ўвесь час, на вякі вякоў. Амін.

Душа, пакайся перад адыходам сваім. Суд нямінучы чакае грэшнікаў.Таму цяпер кліч Госпада са сьлязьмі каяньня: зграшыў, зграшыў прад Табою вольна й нявольна! Шчодры й найлітасьціўшы! Малітвамі нябеснае Маці нашае, Багародзіцы, сьвятых апосталаў і ўсіх сьвятых, зьлітуйся й ратуй мяне. Амін.



## МАЛІТВА ПРЫ ЎВАХОДЗЕ Ў СЬВЯТЫНЮ БОЖУЮ

Уваходжу ў сьвяты Дом Твой, каб пакланіцца велічы Тваёй і ўзьнесьці сваю шчырую малітву да Цябе, Уладару сьвету.

Стоячы прад Табою, Госпадзе, я прыношу ўсе свае справы жыцьця майго, і Ты дабраслаў маю шчырую працу, мае добрыя намеры й вядзі мяне бясьпечнаю дарогаю, каб не пахіснуліся ногі мае.

Дзякую Табе, Ойча нябесны, за ўсе дары, якія пасылае нам бацькоўская рука Твая.

Я слаўлю Цябе, Уладару неба й зямлі, як Радасьць жыцьця нашага; як Сьвятло, што асьвятляе жыцьцё наша; як Правадацеля, што накіроўвае наша жыцьцё на правільны шлях; як Судзьдзю, што ўсім аддасьць паводле таго, як хто заслужыў; як Дабрачынцу, што шчодраю рукою памагае тым, хто на Цябе надзееецца.

Няхай любаю будзе Табе сёньняшняя мая малітва, як духмянае кадзіла, як шчырая ахвяра сэрца майго Табе, Госпадзе. Амін.



## МАЛІТВА ЗА БЕЛАРУСЬ

Магутны Божа! Ўладар сусьветаў,
вялікіх сонцаў і сэрц малых,
над Беларусяй ціхай і ветлай
рассып праменьне Свае хвалы.

Дай спор у працы спакойнай, шэрай,
на хлеб штадзённы, на родны край.
Павагу, сілу і веліч веры
у нашу праўду, у прышласьць - дай!

Дай урадлівасьць жытнёвым нівам,
учынкам нашым пашлі ўмалот.
Зрабі свабоднай, зрабі шчасьлівай
краіну нашу, і наш народ.

## ТРАПАРЫ, КАНДАКІ, ПРАКІМЕНЫ, АЛІЛУЯРЫ Й ПРЫЧАСЬНІКІКІ

### Нядзельныя

Сьпеў 1.

Трапар:

Калі камень быў запячатаны Габрэлмі і жаўнеры сьцераглі найчысьцейшае цела Тваё, Ты ўваскрос на трэці дзень, Збаўца, даючы людзтву жыцьцё. Дзеля гэтага сілы нябесныя ўсклікалі да Цябе, Жыцьцядаўца: слава ўваскрасеньню Твайму, Хрысьце, слава валадарству Твайму, слава прадбачнасьці Тваёй, адзіны Чалавекалюбны.

Кандак:

Ты ўваскрос з магілы ў славе, як Бог, і ўвесь сьвет увфскрасіў Сабою. Людзкая прырода праслаўляе Цябе, як Бога, і зьнікла сьмерць. Адам весяліцца Ўладару і Ева ця-



пер, вызваленая з путаў, усклікае: Ты Хрыстос, што даеш усім нам уваскрасеньне.

Пракімен:

Няхай ласка Твая, Госпадзе, будзе над намі, як мы спадзяёмся на Цябе (Пс.32/33:22).

Верш:

Сьпявайце з радасьці, справядлівыя ў Госпадзе, праведнікам выпадае ўсхваляць (Пс.32/33:1).

Алілуяр:

Бог, Які памсьціўся за мяне, пакарыў народы пад мяне (Пс. 17/18:48).

Верш:

Бо Ты вызваліў караля Твайго й ласку даеш памазанцу Твайму Давіду, і насеньню ягонаму навекі (Пс.17/18:51).

Прычасьнік:

Хвалеце Госпада зь нябёсаў, хвалеце Яго на вышынях (Пс. 148:1).



Увага:

Гэты прычасьнік нядзельны і ён сьпяваецца ў кожную нядзелю, калі не пададзены іншы.

Сьпеў 2.

Трапар:

Калі зыйшоў быў к сьмерці Жыцьцё несьмяротнае, тады пекла забіў зьзяньнем боства.Калі-ж і памерлых з прадоньня ўваскрасіў, усе сілы нябесныя ўсклікалі: Жыцьцядаўца, Хрысьце Божа наш, слава Табе.

Кандак:

Ты ўваскрос з магілы, Усемагутны Збаўца, і пекла, бачачы цуда, спужалася, і памерлыя ўваскрэсьлі; стварэньне, бачыўшы гэта, радуецца з Табою, і Адам з усім сьветам весяліц ца, увесь час праслаўляючы Цябе, Збаўца мой.

Пракімен:

Сіла мая й песьня Госпад, істаў мне збаўленьнем (Пс. 117/118:14).



Верш:

Балюча караў мяне Госпад, але на сьмерць не аддаў мяне (Пс. 117/118:18).

Атілуяр:

Няхай пачуе цябе Госпад у дзень смутку. няхай заслоніць цябе імя Бога Якубавага (Пс. 19/20:2).

Верш:

Госпадзе, ратуй! Няхай адкажа нам Валадар у дзень, калі мы клічам Яго (Пс. 19/20:10).

Сьпеў 3.

Трапар:

Няхай весяляцца нябесныя, няхай радуюцца зямныя,бо Госпад гэтак паказаў моц магутнасьці Сваёй: перамогшы сьмерцяю сьмерць, першым сярод мёртвых быў, зь пекла вызваліў нас, і даў людзям вялікую міласьць.

Кандак:

Ты сёньня ўстаў з магілы, Шчодры, і вывеў нас з варотаў сьмяротных. Сёньня Адам весяліцца й радуецца Ева, і зь імі пракокі з патрыярхамі бязупынна праслаўляюць боскую сілу ўлады Тваёй.

Пракімен:

Сьпявайце Богу, сьпявайце: сьпявайце Каралю нашаму, сьпявайце (Пс.46/47:7).

Верш:

Беце ў ладкі, усе людзі, клічце Бога голасам радасьці (Пс. 46/47:1).

Алілуяр:

На Цябе, Госпадзе, спадзяюся, няхай не засаромлюся навекі (Пс. 30/31:2).

Верш:

Будзь мне моцнаю скалою, домам прыпынку. каб ратавацца мне (Пс. 30/31:3).



Сьпеў 4.

Трапар:

Сьветлую ўваскрасеньня пропаведзь ад анёла даведаліся Госпадавы вучні, і прадзедаў засуджэньне сьсінута; апосталам хвалячыся казалі: перамог сьмерць, уваскрос Хрыстос Бог, даючы людзям вялікую міласьць.

Кандак:

Ратавальнік і Збаўца мой, як Бог, уваскрос з магілы - з путаў земнародных, і вароты пекла зьнішчыў, і ён уваскрос, як Уладар, на трэці дзень.

Пракімен:

Якія вялікія ўчынкі Твае, Госпадзе, усё Ты прамудрасьцяй стварыў (Пс.103/104:24).

Верш:

Дабраслаў, душа мая, Госпада; Госпадзе, Божа мой, у красу й веліч Ты апрануўся (Пс. 103/104:1).



Алілуяр:

Імкніся змагацца за праўду, лагоднасьць і справядлівасьць Шс. 44/45:5).

Верш:

Ты ўзьлюбіў справядлівасьць і зьненавідзеў нягоднасьць (Пс. 44/45:8).

Сьпеў 5.

Трапар:

Спрадвечнае Слова Айцу й Духу, зь Дзевы радзіўся на збаўленьне нашае, засьпяваем верныя і паклонімся: дабражадаў бо целам узыйсьці на крыж і сьмерць працярпець, і ўваскрасіць памерлых слаўным уваскрасеньнем Сваім.

Кандак:

Ты ўвайшоў быў у пекла, Збаўца мой, і ягоныя вароты разбурыў, як УсемагутныД памерлых уваскрасіў Ты, як Тварэц,і джала сьмерці зьнішчыў, і вызваліў Адама ад



праклёну, таму ўсе мы, Чалавекалюбны, ўсклікаем: ратуй і нас, Госпадзе.

Пракімен:

Ты, Госпадзе,абароніш нас і ўсьцеражэш нас ад гэтага роду навекі (Пс. 11/12:8).

Верш:

Памажы,Госпадзе,бо ня стала пабожнага, бо шчэзьлі верныя (Пс. 11/12:2).

Алілуяр:

Ласку Госпадаву буду -апяваць навекі, ад пакаленьня да пакаленьня буду агалашаць вернасьць Тваю вуснамі сваімі (Пс. 88/89:2).

Верш:

Бо я кажу: «Навекі будзе збудавана ласка Твая, і ў нябёсах Ты ўстановіш вернасьць Сваю» (Пс. 88/89:3).

Сьпеў 6.

Трапар:

Анельскія сілы на магіле Тваёй, а сьцярогшыя тут амярцьвелі, і стаяла Марыя ў магіле, шукала найчысьцейшага цела Твайго. Зьняволіў пекла,не спакусіўся празь яго, наведаў Дзеву і даў жыцьцё, уваскрос зь мёртвых, Госпадзе, слава Табе.

Кандак:

Уваскрасіўшы памерлых зь цемры бяздоньня Сваёй жыцьцятворчай рукой, усіх Бог Хрыстос, і даў уваскрасеньне людзкому роду. Таму ён Збаўца ўсіх, і ўваскрасеньне, і жыцьцё, і Бог усіх.

Пракімен:

Ратуй, Госпадзе,людзей Тваіх і дабраслаў насьледзьдзе Тваё (Пс. 27/28:9).

Верш:

Да Цябе, Госпадзе, я ўсклікаю: скала мая! Ня будзь глухім да мяне (Пс. 27/28:1).



Алілуяр:

Той, хто жыве ў патайным схове Найвышэйшага, у цені Ўсемагутнага спачывае (Пс. 90/91:1).

Верш:

Скажу Госпаду: Ты мой прыпынак і цьвярдыня мая, Бог мой,на Якога спадзяюся (Пс.90/91:2).

Сьпеў 7.

Трапар:

Разбурыў крыжам Сваім сьмерць, адчыніў разбойніку рай, міраносіцам плач устрымаў і апосталам навучаць загадаў, і як уваскрослы Ты, Хрысьце Божа, даў людзям вялікую міласьць.

Кандак:

Улада сьмерці ня можа далей няволіць людзей, бо зыйшоў Хрыстос і разбурыў сілы яе. Абясьсіленае пекла, і з таго пракорокі супольна радуюцца, кажучы: «Збаўца зьявіўся веруючым. Выходзьце, вернікі, на ўваскрасеньне».



Пракімен:

Госпад сілу людзям Сваім дае! Госпад дабраславіць людзей Сваіх спакоем (Пс. 28/29:11).

Верш:

Дайце Госпаду, сыны Божыя, дайце Госпаду славу й моц (Пс. 28/29:1).

Алілуяр:

Добра дзякаваць Госпаду, сьпяваць хвалу імені Твайму, Найвышэйшы (Пс. 91/92:2).

Верш:

Абвяшчаць нараніцы ласку Тваю, а вернасьць Тваю ўначы (Пс. 91/92:3).

Сьпеў 8.

Трапар:

З вышыні зыйшоў Міласэрны, пахаваньне прыняў трыдзённае і нас вызваліў ад пакутаў. Жыцьцё і ўваскрасеньне наша, Госпадзе, слава Табе.



Кандак:

Ты ўваскрос з магілы,падняў памерлых і Адама ўваскрасіў і Ева весяліцца з Твайго ўваскрасеньня. Усе канцы сьвету ўрачыста сьвяткуюць, бо Ты ўстаў з памерлых, Многалітасьцівы.

Пракімен:

Давайце і выконвайце абяцаньні Госпаду, Богу вашаму (Пс.75/76:12).

Верш:

Ведамы ў Юдэі Бог,у выбраных вялікае імя Ягонае (Пс.75/76:2).

Алілуяр:

Прыйдзеце,засьпяваем Госпаду, услаўляць будзем Скалу збаўленьня нашага (Пс.94/95:1).

Верш:

Станьма прад абліччам Ягоным і з падзякаю псальмы сьпявайма Яму (Пс. 94/95:2).



*Уваскрасеньне Ісуса Хрыста*



ВЯЛІКДЗЕНЬ

Трапар, сьпеў 5.

Хрыстос уваскрос зь мёртвых, сьмерцяю сьмерць патаптаў і тым, што ў магілах, жыцьцё падарыў.

Кандак, сьпеў 8.

Хоць Ты ў магілу зыйшоў, Несьмяротны, але пякельную сілу зьнішчыў і ўваскрос, як Пераможца, Хрысьце Божа, і жанчынам-міраносіцам сказаў: «Радуйцеся!», і мір даў апосталам Сваім і памерлым уваскрасеньне падаў.

Пракімен, сьпеў 8.

Гэта той дзень, што стварыў яго Бог: будзем цешыцца і весяліцца ў ім (Пс. 117/118:24).

Верш:

Дзякуйце Госпаду, бо ён добры, бо навекі міласэрдзе Ягонае (Пс. 117/118:1).

Алілуяр, сьпеў 4.

Ты ўваскрэсьнеш, зьлітуешся над Сыёнам (Пс. 101/102:14).



Верш:

Госпад зь неба на зямлю глядзеў (Пс. 101/102:20).

Прычасьнік:

Хвалеце Госпада зь нябёсаў, хвалеце Яго на вышынях (Пс. 148:1).

ТРАПАРЫ 12 СЬВЯТАМ

НАРАДЖЭНЬНЕ ХРЫСТОВАЕ
(Каляды - 25 сьнежня)

Трапар, сьпеў 4.

Нараджэньне Тваё, Хрысьце Божа наш, асьвяціла людзей сьвятлом богапазнаньня. Бо тыя, што служылі зоркам, зоркаю-ж былі навучаныя пакланяцца Табе, Сонцу праўды, і ведаць Цябе, Усходзе з вышыняў. Госпадзе слава Табе!

Кандак, сьпеў 3.

Сёньня Дзева ідзе нявымоўна радзіць прадвечнае Слова; радуйся,



сусьвет, пачуўшы пра гэта, праслаў з анёламі й пастухамі Дзіцё, што хоча зьявіцца, - прадвечнага Бога.

Пракімен, сьпеў 8.

Уся зямля паклоніцца Табе і будуць сьпяваць імені Твайму (Пс. 65/66:4).

Верш:

Весела гукайце Богу, уся зямля. Сьпявайце славу імені Яго, дайце славутую хвалу Яму (Пс. 65/66:1).

Алілуяр, сьпеў 1.

Нябёсы вяшчаюць славу Божую, а твор рук Ягоных агалашае небасьхіл (Пс. 18/19:2).

Верш:

Дзень дню пераліває гаворку, і ноч ночы агалашае веду (Пс. 18/19:3).

Прычасьнік:

Госпад паслаў вызваленьне людзям Сваім (Пс. 110/111:9).





## ХРОСТ ГОСПАДА

(Вадохрышча, Богазьяўленьне,
Ярдан - 6 студзеня)

Трапар, сьпеў 1.

Калі ў Ярдане хрысьціўся Ты Госпадзе, тройчнае зьявілася пакланеньне; бо голас Айцоўскі сьветчыў аб Табе, улюбёным Сынам Цябе называючы; і Дух у выглядзе галубіным пацьвярджаў словы вяшчаньня; зьявіўся, Хрысьце Божа, і сьвет азарыў, слава Табе.

Кандак, сьпеў 4.

Сёньня Ты зьявіўся цэламу сьвету, і сьвятло Тваё, Госпадзе, азначылася на нас, што разумна славім Цябе. Ты прыйшоў, зьявіўся Ты Сьвятлом вечным.

Пракімен, сьпеў 4.

Дабраславёны той, хто прыходзіць у імя Госпадава. Госпад ёсьць Бог, і ён асьвятліў нас (Пс. 117/118:26-27).



Верш:

Дзякуйце Госпаду, бо ён добры, бо навекі міласэрдзе Яго (Пс. 117/118:1).

Алілуяр, сьпеў 4.

Дайце Госпаду, сыны Божыя, дайце Госпаду славу і моц (Пс. 28/29:1).

Верш:

Голас Госпадаў над водамі; Бог славы грыміць, Госпад над водамі вялікімі (Пс.28/29:3).

Прычасьнік:

Бо зьявілася ласка Божая, што ратуе ўсіх людзей (Ціт.2:11).

## СПАТКАНЬНЕ ГОСПАДА
(Грамніцы - 2 лютага)

Трапар, сьпеў 1.

Радуйся, дабрадатная Багародзіца Дзева, бо зь Цябе зазьзяла сонца праўды, Хрыстос Бог наш, што прасьвятляе тых, хто ў цемры: ве-



сяліся й ты, старча справядлівы, што прыняў на рукі Хрыста-Вызваліцеля душаў нашых, Які падае нам уваскрасеньне.

Кандак, сьпеў 1.

Ты ўлоньне Дзевічае Сваім нараджэньнем асьвяціў і рукі Сымонавы дабраславіў, папярэдзіўшы, як належаласяД сёньня збавіў нас, Хрысьце Божа; спыні войны між людзьмі і ўмацуй праваслаўных хрысьціянаў, тых, што Ты палюбіў, адзіны чалавекалюбны.

Пракімен, сьпеў 3.

Праслаўляе душа мая Госпада і ўсьцешыўся дух мой у Богу, Збаўцу маім (Лк. 1:46-47).

Верш:

Бо глянуў ён на паніжэньне слугі Свае; вось адгэтуль за шчасьлівую мяне будуць мець усе пакаленьні (Лк. 1:48).

Алілуяр, сьпеў 8.

Цяпер адпушчаеш слугу Свайго,

Уладару, паводле слова Свайго, у супакоі (Лк. 2:29).

Верш:

Сьвятло для аб'яўленьня паганам і славу Тваім выбраным (Лк. 2:32).

Прычасьнік:

Чару збаўленьня прыйму і імя Госпадава прызаву (Пс. 115:4/116:13).

## ЗЬМЯНЕНЬНЕ ГОСПАДАВА

(Спаса - 6 жнівеня)

Трапар, сьпеў 7.

Адмяніўся Ты на гары, Хрысьце Божа, паказаў вучням Сваім славу Тваю, колькі маглі ўспрыняць яе. Няхай зазьзяе нам грэшным сьвятло Тваё заўсёды існае, малітвамі Багародзіцы, Сьветладаўца, слава Табе.

Кандак, сьпеў 7.

На гары адмяніўся Ты, Хрысьце Божа, і вучні Твае пабачылі, колькі маглі, славу Тваю; каб разумелі, як пабачаць Цябе ўкрыжаванага, што Ты пакутуеш са Свае волі, і каб агалашалі сьвету, што Ты запраўды Айцоўскае зьзяньне.



Пракімен, сьпеў 4.

Якія вялікія ўчынкі Твае, Госпадзе, усё Ты прамудрасьцяй стварыў (Пс. 103/104:24).

Верш:

Дабраслаў, душа мая, Госпада; Госпадзе, Божа мой, у красу й веліч Ты апрануўся (Пс. 103/104:1).

Алілуяр, сьпеў 8.

Тваё ёсьць неба і Твая зямля (Пс. *88/89:12).*

Верш:

Шчасьлівыя людзі, што ведаюць Твой трубны кліч (Пс. 88/89:16).

Прычасьнік:

У сьвятле аблічча Твайго, Госпадзе, яны пойдуць, у імені Тваім весяляцца яны навекі (Пс. 88/89:16-17).



## ПАДНЯЦЬЦЕ КРЫЖА ГОСПАДАВАГА

(14 верасьня)

Трапар, сьпеў 1.

Збаў, Госпадзе, людзей Тваіх і дабраслаў насьледзьдзе Тваё, перамогу праваслаўным хрысьціянам над супраціўнымі дай, і Тваім Крыжам сьвятым ахоўвай жыхарства Тваё.

Кандак, сьпеў 4.

Ты ўзьнёсься дабраахвотна на крыж, Хрысьце Божа, пашлі шчадроты Твае хрысталюбнаму новаму жыхарству, разьвесялі сілаю Тваёю праваслаўных хрысьціянаў, перамогу над супраціўнымі ім дай, бо яны маюць у помач Тваю зброю міру, неперраможны знак перамогі.

Пракімен, сьпеў 7.

Узвышайце Госпада, Бога нашага, і пакланецеся падножжу ног Ягоных, бо сьвяты ён (Пс. 98/99:5).



Верш:

Госпад уладарыць, няхай людзі дрыжаць (Пс. 98/99:1).

Алілуяр, сьпеў 1.

Успомні грамаду Сваю, што Ты прыдбаў здаўна (Пс. 73/74:2).

Верш:

Бог-жа ёсьць Каралём маім здаўна, Які чыніць збаўленьне на зямлі (Пс. 73/74:12).

Прычасьнік:

Узьнімі над намі, Госпадзе, сьвятло аблічча Свайго (Пс.4:7).

## УВАХОД У ЕРУСАЛІМ ГОСПАДА

(Вербная нядзеля, Вербніца)

Трапар, сьпеў 1.

Запэўняючы,што будзе агульнае ўваскрасеньне, Ты, Хрысьце Божа, перад Сваімі пакутамі ўваскрасіў зь мёртвых Лазара. Дзеля гэтага і мы, як дзеці, нясучы знакі пера-

могі, усклікаем да Цябе, Пераможца сьмерці: ратуй нас, Які жывеш у нябёсах! Дабраслаўёны той, хто ідзе на славу Госпаду.

Кандак, сьпеу 6.

На небе на пасадзе, а на зямлі на асьляці, Ты, Хрысьце Божа, прыняў слаўленьне анёлаў і песьню дзяцей, што ўсклікаюць да Цябе: дабраслаўёны Ты, што ідзеш Адама вярнуць.

Пракімен, сьпеў 4.

Дабраслаўёны той, хто прыходзіць у імя Госпадава. Госпад ёсьць Бог, і ён асьвятліў нас (Пс. 117/118:26-27).

Верш:

Дзякуйце Госпаду, бо ён добры, бо навекі міласэрдзе Яго (Пс. 117/118:1).

Алілуяр, сьпеў 1.

Сьпявайце Госпаду новую песьню, бо ён учыніў цуд (Пс. 97/98:1).



Верш:

Убачылі ўсе канцы зямлі збаўленьне Бога нашага (Пс. 97/98:3).

Прычасьнік:

Дабраслаўлёны той, хто прыходзіць у імя Госпадава. Госпад ёсьць Бог, і ён асьвятліў нас (Пс. 117/118:26-27).

## УЗЬНЯСЕНЬНЕ ГОСПАДАВА

(Ушэсьце)

Трапар, сьпеў 4.

Ты ўзьнёсься ў славе, Хрысьце Божа наш, узрадаваў вучняў абяцаньнем Сьвятога Духа, - пасьля таго як добрая вестка, Тваё дабраславеньне ўмацавала іхную веру, што Ты - Сын Божы, Збаўца сьвету.

Кандак, сьпеў 6.

Ты, што выканаў справу нашага збаўленьня і зямных зьяднаў зь нябесным, Ты ўзьнёсься ў славе, Хрысьце Божа наш, аніяк не адлучыўся, але прабываеш з намі бязупынна і кажаш тым, хто любіць Цябе: Я з вамі, і ніхто ня будзе супраць вас.



Пракімен, сьпеў 7.

Узьніміся, Божа, над нябёсы, і над усёю зямлёю слава Твая (Пс. 107/108:6).

Верш:

Прыгатавана сэрца маё, Божа, прыгатавана сэрца: я буду пяяць і граць (Пс. 56/57:8).

Алілуяр, сьпеў 2.

Узыйшоў Бог сярод выкрыкаў радасьці, Госпад сярод гуку трубнага (Пс. 46/47:6).

Верш:

Беце ў ладкі, усе людзі, гукайце Богу голасам радасьці (Пс.46/47:1).

Прычасьнік:

Узыйшоў Бог сярод выкрыкаў радасьці. Госпад сярод гуку трубнага (Пс.46/47:6).



## СЬВЯТАЯ ТРОЙЦА

(Сёмуха, Зялёнае сьвята)

Трапар, сьпеў 8.

Дабраслаўёны Ты, Хрысьце Божа наш, што мудрымі рыбакоў зрабіў, паслаўшы ім Сьвятога Духа, ды імі злавіў увесь сьвет, Чалавекалюбны, слава Табе.

Кандак, сьпеў 8.

Калі Найвышэйшы, зыйшоўшы, зьмяшаў мовы, дык падзяліў Ен народы. А калі раздаў вогненныя языкі, то клікаў усіх да еднасьці, і мы аднадушна славім найсьвяцейшага Духа.

Пракімен, сьпеў 8.

Па ўсёй зямлі прайшоў гук іхны і да канца сьвету словы іх (Пс. 18/19:5).

Вереш:

Нябёсы весьцяць славу Божую і аб учынках рук Ягоных агалашае прастор (Пс. 18/19:1).

Алілуяр, сьпеў 1.

Словам Госпадавым створаны нябёсы і духам вуснаў Ягоных - усе сілы іх (Пс.32/33:6).

Верш:

Зь нябёсаў глядзіць Госпад, бачыць усіх сыноў людзкіх (Пс. 32/33:13).

Прычасьнік:

Дух Твой няхай вядзе мяне шляхам праўды (Пс. 142/143:10).

## ДАБРАВЕШЧАНЬНЕ

(25 сакавіка)

Трапар, сьпеў 4.

Сёньня пачатак нашага збаўленьня і з прадвечнага Таінства выяўленьне, Сын Божы Сынам Дзевы становіцца, і Габрыель дабрыню дабравесьціць. Таму й мы зь ім усклікнем да Багародзіцы: радуйся, дабрадатная, Госпад з Табою!



Кандак. сьпеў 8.

Табе, Праваднічцы ваяўнічай, мы, слугі Твае, песьню перамогі сьпяваем; мы, выратаваны ад зла, удзячныя песьні ўзносім Табе, Багародзіца, якая маеш уладу непераможную; з усякіх бед вызваляй нас, каб мы голасна сьпявалі Табе: радуйся, Дзева нявінная.

Пракімен, сьпеў 4.

Агалашайце з дня на дзень збаўленьне Ягонае (Пс. 95/96:2).

Верш:

Сьпявайце Госпаду новую песьню, сьпявай Госпаду ўся зямля (Пс. 95/96:1).

Алілуяр, сьпеў 1.

Ен зыйдзе, як дождж пасьля касьбы, як кроплі, што навадняюць зямлю (Пс. 71/72:6).

Верш:

Будзе імя Ягонае трываць навекі, перад сонцам будзе трываць імя Ягонае (Пс. 71/72:17).



Прычасьнік:

Бо Госпад выбраў Сыён, пажадаў на сялібу Сабе (Пс.131/132:13).

## УСЬПЕНЬНЕ БАГАРОДЗІЦЫ

(15 жнівеня)

Трапар, сьпеў 1.

У нараджэньні дзявоцтва захавала Ты,ува ўсьпеньні сьвету не пакінула Ты, Багародзіца: перанеслася да жыцьця Маці запраўднага Жыцьця; і малітвамі Тваймі ратуй ад сьмэрці душы нашы.

Кандак, сьпеу 2.

Багародзіцу, нястомную ў малітвах і цьвёрдую надзею ў абароне, ня ўтрымалі ні магіла ні сьмяротнасьць; бо Яе, як Маці жыцьця, прадставіў да жыцьця Той, што ўсяліўся ў Ейным усячасна нявінным улоньні.

Пракімен, сьпеу 3.

Праслаўляе душа мая Госпада і



усьцешыўся дух мой у Богу, Збаўцу маім (Лк. 1:46/47).

Верш:

Бо глянуў Ён на паніжэньне слугі Свае; вось адгэтуль за шчасьлівую мяне будуць мець усе пакаленьні (Лк. 1:48).

Алілуяр, сьпеў 2.

Узьніміся, Госпадзе, ды йдзі на месца супачынку Свайго, Ты й ківот сілы Твае (Пс. 131/132:8).

Верш:

Прысягаў Госпад Давіду ў праўдзе - Ён не адступае ад яе (Пс. 131/132:11).

Прычасьнік:

Чару збаўленьня прыйму і імя Госпадава прызаву (Пс. 115:4/116:13).

## НАРАДЖЭНЬНЕ БАГАРОДЗІЦЫ

(8 верасьня)

Трапар, сьпеў 4.

Нараджэньне Тваё, Багародзіца Дзева, абвесьціла радасьць усяму сьвету, бо зь Цябе зазьзяла Сонца праўды: Хрыстос Бог наш зьнішчыў праклён, ён даў дабраславеньне і зьнішчыў сьмерць, і даў нам жыцьцё вечнае.

Кандак, сьпеў 4.

Сьвятым нараджэньнем Тваім, Найчысьцейшая, вызваліла Акіма й Ганну з ганьбы бязьдзетнасьці, а Адама й Еву ад сьмяротнай гібелі. Яго-ж сьвяткуюць і людзі Твае, што збавіліся ад асуджэньня за грахі, да Цябе прамаўляюць: «Няплодная нараджае Багародзіцу і Маці жыцьця нашага».

Пракімен, сьпеў 3.

Праслаўляе душа мая Госпада і ўсьцешыўся дух мой у Богу, Збаўцу маім (Лк. 1:46-47).



Верш:

Бо глянуў ён на паніжэньне слугі Свае (Лк. 1:48).

Алілуяр, сьпеў 8.

Слухай, дачка, і глянь ды нахіні вуха сваё (Пс. 44/45:11).

Верш:

Найбагацейшыя з народу будуць маліцца прад Табою (Пс. 44/45:13).

Прычасьнік:

Госпадава прызаву (Пс. 115/116:4).

## УВЯДЗЕНЬНЕ БАГАРОДЗІЦУ Ў СЬВЯТЫНЮ

(21 лістапада)

Трапар, сьпеў 4.

Сёньня першае выяўленьне міласьці Божай і прадказаньне збаўленьня людзей, бо ў сьвятыні Божай адкрыта зьяўляецца Дзева і ўсім прадказвае Хрыста. Таму й



мы ёй усклікнем: радуйся, зьдзейсьненьне Творчага прадвызначэньня.

Кандак, сьпеў 4.

Найчысьцейшая сьвятыня Збавіцеля, дарагацэнны палац і Дзева, скарбніца славы Божай, сёньня ўводзіцца ў дом Божы, прыносіць з сабою ласку, што ў боскім Духу. Яе анёлы Божыя ўслаўляюць. Яна - сяліба нябесная.

Пракімен, сьпеў 3.

Праслаўляе душа мая Госпада і ўсьцешыўся дух мой у Богу, Збаўцу маім (Лк. 1:46-47).

Верш:

Бо глянуў ён на паніжэньне слугі Свае; вось адгэтуль за шчасьлівую мяне будуць мецць усе пакаленьні (Лк. 1:48).

Алілуяр, сьпеў 8.

Слухай, дачка, і глянь ды нахіні вуха сваё (Пс.44/45:11).



Верш:

Найбагацейшыя з народу будуць маліцца прад Табою (Пс. 44/45:13).

Прычасьнік:

Чару збаўленьня прыйму і імя Госпадава прызаву (Пс. 115/116:4).

## СЬВЯТЫМ

## БОЖАЙ МАЦІ ЖЫРОВІЦКАЙ

(7 травеня)

Трапар, сьпеў 4.

Хто патрабуе Твае дапамогі, Уладарка, не адкінь ад Сябе, але міласэрдзе акажы ўсім, хто да Цябе зьвяртаецца перад цудатворным Тваім абразом, у смутку нас пацеш, Міласэрная, і ад сьлёз да радасьці й надзеі накіруй, бо Табе толькі ўсе цяжкасьці вядомыя і на Цябе спадзяёмся.

Кандак, сьпеў 3.

Сёньня Дзева прад намі ў сьвятыні стаіць і з мноствам сьвятых нябачна за нас моліцца Богу; анёлы з архірэямі пакланяюцца, а апосталы з прарокамі радуюцца, бо за нас Багародзіца просіць прадвечнага Бога.

Пракімен, сьпеў 3.

Праслаўляе душа мая Госпада і ўсьцешыўся дух мой у Богу, Збаўцу маім (Лк. 1:46-47).

Верш:

Бо глянуў ён на паніжэньне слугі Свае; вось адгэтуль за шчасьлівую мяне будуць мецьусе пакаленьні (Лк. 1:48).

Алілуяр, сьпеў 8.

Слухай, дачка, і глянь ды нахіні вуха сваё (Пс. 44/45:11).

Верш:

Найбагацейшыя з народу будуць маліцца прад Табою (Пс. 44/45:13).



Прычасьнік:

Чару збаўленьня прыйму і імя Госпадава прызаву (Пс. 115/116:4).

## ПОКРЫВА НАЙСЬВЯЦЕЙШАЙ БАГАРОДЗІЦЫ

(14 кастрычніка)

Трапар, сьпеў 4.

Сёньня мы, праваслаўныя людзі, урачыста сьвяткуем, атуленыя Тваім зьяўленьнем, Божая Маці, падняўшы вочы да найчысьцейшага абраза Твайго, ласкава просім: ахіні нас Тваім шляхотным пакровам і ратуй нас ад усякага зла, просячы Сына Твайго, Хрыста Бога нашага, каб ратаваў душы нашы.

Кандак, пракімен, алілуяр і прычасьнік глядзі вышэй у «Божая Маці Жыровіцкая».



## СЬВ. КІРЫЛА ТУРАЎСКІ

(28 красавіка)

Трапар, сьпеў 8.

З вуснаў Тваіх зазьзяла ласка, як сьвятло агня, прасьвятліла Беларусь; вышыню пакоры, мудрасьці нам паказаў. Але тваймі словамі навучаныя, ойча Кірыла, Беларускі Залатавусны, прасі Слова Хрыста Бога, каб уратавацца душам нашым.

Кандак, сьпеў 6.

Зь нябёсаў ты атрымаў Боскую ласку і тваймі вуснамі вучыш усіх нас пакланяцца адзінаму ў Тройцы Богу, Кірыла Залатавусны, сьвяты ўсешляхотны,/мы належна славім цябе, бо-ж ты настаўнік, што боскае навучаеш.

Пракімен, сьпеў 1.

Вусны мае будуць казаць мудрае, думкі-ж сэрца майго - разумнасьць (Пс. 48/49:4).



Верш:

Слаўце гэта, усе людзі; нахілеце вуха, усе жыхары сьвету (Пс. 48/49:1).

Алілуяр, сьпеу 2.

Вусны справядлівага выказваюць мудрасьць, а язык ягоны гаворыць пра справядлівасьць (Пс. 36/37:30).

Верш:

Закон Бога ў сэрцы ягоным і ступні ягоныя не пакаўзнуцца (Пс. 36/37:31).

Прычасьнік:

Памяць аб справядлівым будзе вечнай/ Няма чаго баяцца яму благой весткі (Пс.111/112:6-7).

## СЬВ. ЕЎФРАСІНЬНЯ ВЯЛІКАЯ,

Князёўна Полацкая

(23 травеня)

Трапар, сьпеу 8.

Прыкладам тваім, маці, Прасьветніца Беларусі, можна збавіціся, бо ты ўзяла крыж і пайшла за

Хрыстом і прыкладна вучыла, як трэба грэбаваць целам, а ходацца за душу несьмяротную. Дзеля гэтага, дастойная Еўфрасіньня Вялікая. князёўна Полацкая, твой дух будзе радавацца разам з анёламі.

Кандак, сьпеў 2.

Зь любоўю да Госпада, дастойная, жаданьне супакою ты зьнеахвоціла, постам прасьвяціўшы душу сваю, моцных ворагаў пераадолела ты; але малітвамі тваймі ворагаў зухаватасьць зьнішчы.

Пракімен, сьпеў 4.

Вялікі Бог у сьвятасьці Сваёй, Бог выбраных (Пс.67/68:36).

Верш:

У грамадах дабраслаўце Госпада Бога, вы з крыніцы Ізраэлевай (Пс. 67/68:27).

Алілуяр, сьпеў 1.

Я надта спадзяваўся на Госпада. Ен сьхіліўся да мяне і пачуў галашэньне маё (Пс.39/40:2).



Верш:

Бог нам ахова й сіла, помач у бедах, што часта здараюцца (Пс. 45/46:2).

Прычасьнік:

Памяць аб справядлівым будзе вечнай. Няма чаго баяцца яму благое весткі (Пс. 111/112:6-7).

## ВЯЛІКОДНАЕ СЛОВА
## сьв. ЯНА ЗАЛАТАВУСНАГА

Калі хто цнатлівы й *багалюбны,* няхай раскашуецца гэтай добрай і сьветлай урачыстасьцяй. Калі хто слуга разумны, няхай увойдзе з радасьцю ў радасьць Госпада свайго. Калі хто мацаваўся посьцячы, няхай прыйме сёньня плату. Калі хто ад першае гадзіны пасьціўся, няхай прыйме сё ньня справядлівую заплату. Калі хто па трэцяй гадзіне прыйшоў, няхай, дзякуючы, весяліцца. Калі хто па шостай гадзіне, няхай ані не сумляваецца, бо ў нічым не адхінаецца. Калі



хто дзявятую гадзіну прапусьціў, няхай прыступіць не сумляваючыся і не баючыся. Калі хто толькі ў адзінаццатую гадзіну зьявіўся, няхай не баіцца свайго спазьненьня, бо міласэрны Ўладар: Ен прыймае апошняга так, як першага; супакоіць і таго, хто ў адзінаццатай гадзіне прыйшоў, як і таго, хто працаваў ад першае гадзіны. Ён апошняга мілуе і першаму дагаджае, і таму дае і гэтага ўзнагараджае: і працу прыймае і намер цалуе, учынкі славіць і жаданьне хваліць. Таму ўвайдзеце ў радасьць Госпада свайго: і першыя і другія, заплату прымеце багатыя й бедныя, адзін з адным весялецеся, цешцеся руплівыя й лянівыя, дзень услаўляйце тыя, што пасьціліся, і тыя, што не пасьціліся: усе ўзьвесялецеся сёньня! Стол багаты, раскашуйцеся ўсе! Цялё адкормленае, няхай ніхто не адыйдзе галодны: усе раскашуйцеся на банкеце веры, усе ўспрымеце багацьце ласкаў. Няхай ніхто ня плача над сваё ю беднасьцю, бо



зьявілася боскае валадарства. Няхай ніхто ня плача над грахамі сваймі, бо выбачэньне з магілы зазьзяла! Няхай ніхто не баіцца сьмерці,бо вызваліла нас ад яе Спасава сьмерць: пагасіў яе Ен, Які быў у моцы ейнай, перамог пекла, зыйшоўшы ў пекла, зьнішчыў яго, скаштаваўшы горыч яго. І гэта прадбачыў Ісая: пекла, кажа Ён. зажурылася, пабачыўшы Цябе. Зажурылася, бо развалілася! Зажурылася, бо Ты зьдзекі прыняў! Зажурылася, бо зьвязалася: прыняўшы Цела, Богу скарылася, прыняло зямлю, а спаткала неба! Прыняло, што бачыла, і паддалося таму, чаго ня бачыла. Сьмерць! Дзе тваё джала? Пекла! Дзе твая перамога? Хрыстос Уваскрос, і ты пераможанае! Хрыстос Уваскрос, і палі дэманы! Хрыстос Уваскрос, і радуюцца анё лы! Хрыстос Уваскрос, і памерлых няма ў магіле! Хрыстос Уваскрос зь мёртвых і стаўся Першым для ўсіх памерлых. І Яму слава, і ўлада, на вякі вякоў. Амін.

## ПРА МАЛІТВУ

Малітва - нашая духовая супольнасьць з Богам. Гэта нашая, любая Яму, размова зь Ім. Таму, прыступаючы да малітвы, мы падымаем вочы да Айца нашага нябеснага. У духу просім выбачэньня ў тых, каму мы якую крыўду ўчынілі, адначасна самі выбачаем усім тым, што нас у нечым скрыўдзілі. Толькі ў такім пагадненьні з усімі можам быць годнымі размовы з Богам, крыніцаю любові, ласкі, міласэрдзя й выбачэньня. Толькі так мы можам сьціраваць думкі свае да Яго і мець надзею, што Ён выслухае нас, прыме малітвы нашы.

Сам Ісус Хрыстос сказаў: «Прасеце і будзе дадзена вам» (Мц. 7:7). Іншым разам сказаў: «І ўсё, чаго будзеце прасіць у малітве зь верай, атрымаеце» (Мц. 21:22). Прыступаючы да малітвы, трэба цьвёрда верыць, што Сын Божы задавольніць добрую просьбу нашую ў належны час, бо Ен лепш ведае,



што й калі патрэбнае для жыцьця, дабра й збаўленьня нашага.

Таму ў малітве мае быць наш поўны давер да Бога, вялікая надзея на ласку Ягоную ды нашая любоў да Яго, адначасна належнае зразуменьне нашых грахоў і правінаў, злучанае з пакораю мытніка, якога Госпад міласэрны апраўдаў ужо за словы: «Божа, будзь літасьцівы да мяне грэшнага» (Лк 18:13).

Айцец і вучыцель Царквы, сьв. Ян Залатавусны вучыць нас: «Уважаю, што кожны чалавек добрае волі пагодзіцца са мною, без малітвы немагчыма весьці цнатлівае жыцьцё ані належна закончыць яго». А сьв. ап. Павал заклікае: «Бязупынна малецеся» (1 Сал. 5:17).

Таму трэба маліцца: рана, удзень і ўвечары, перад і пасьля працы і ў часе працы, як гэта рабілі нашыя пабожныя продкі. Асабліва дні сьвяточныя створаныя для малітвы. Мілым Богу месцам да яе ёсьць дом Божы, сьв. храм.

За каго маем маліцца? Найперш



за сябе самых, за сваіх родных: бацькоў, дзяцей, мужа, жонку, братоў і сёстраў. За сваіх айцоў духоўных, за настаўнікаў, прыяцеляў і знаёмых, за ўвесь Беларускі народ наш, за нашую маці-Беларусь, за край, у якім жывём. Бо Сам Збаўца наш плакаў над доляй Ерусаліму й народу, сярод якога Ён радзіўся як чалавек. Сь. Павал кажа: «Браты! Жаданьне сэрца майго й малітва да Бога за Ізраэль на спасеньне» (Рым. 10:1). А таксама за ўсіх людзей жывых і памерлых: «Дык перш за ўсё прашу ўпрашаць, маліцца ды дзякаваць за ўсіх людзей» (1 Цім. 2:1).

Каб малітва была запраўды мілая Богу, трэба старацца, каб ніхто не перашкаджаў падчас яе, а ўжо ніяк нельга выстаўляць яе на паказ або выхваляцца ёю перад людзьмі. Сам Хрыстос часта маліўся. Тады Ён адыходзіў ад вучняў Сваіх. Гэта самае Ён, Сын Божы, загадваў і нам: «Ты-ж, як молішся, увайдзі ў пакой свой і, зачыніўшы дзьверы, памаліся Айцу свайму,



Які ў тайне; і Айцец твой, што бачыць утоенае, аддасьць Табе яўна» (Мц. 6:6).

Паводле зьместу, малітвы ёсьць: «пахвальныя», у якіх хвалім і славім Бога, Творцу й Збаўцу нашага. за бязьмежную любоў Ягоную да нас,за дасканаласьць і ўсемагутнасьць Ягоную. «Удзячныя», у якіх прыносім нашую падзяку Яму за ўсё: за сваё нараджэньне, за сваіх бацькоў, дзяцей, мужа, жонку, братоў і сёстраў, за кожны добры ўчынак наш, бо ўсё гэта - ласка Яго да нас. Малітвы з «просьбамі», у якіх просім Яго паслаць нам Сваё падтрыманьне, дапамогу ці пацеху. Малітва «Ойча наш» сваім зьместам абыймае усе гэтыя малітвы.

Паводле формы, малітвы ёсьць «нутраныя», калі молімся Богу ў думках сваіх,не вымаўляючы словаў. Гэтыя малітвы выяўляюць пабожны стан нашае душы. Сьв. ап. Павал кажа: «Дык ці ясьце, ці п'яце, ці што іншае робіце, усё рабеце на славу Божую» (1 Кар. 10:31).

У такім стане прабывае кожны пабожны чалавек, і тое, што Ен стала зьядданы з Богам, лёгка пазнаць ужо зь віду ягонага.

«Вонкавыя» малітвы, калі мы вымаўляем словы, жагнаемся, кленчым. Тут найлепшы прыклад нам - Сам Збаўца: калі Ён нічога не гаварыў, кожны бачыў, што Ен дасканала зьядданы з Айцом нябесным, і Сам - выраз боскасьці. Сьв. ап. Мацей так апавядае пра гэта: «І, адыйшоўшыся крыху, паў на аблічча Сваё, маліўся й казаў: -Ойча Мой! Калі магчыма, няхай абміне Мяне чара гэтая; аднак, не як Я хачу, але як Ты!». (Мц.26:39).

Паводле часу, малітвы ёсьць: ранішнія, дзё нныя й вячорныя. Паводле таго,да каго зварачаемся - молімся да Айца нашага нябеснага, Госпада нашага Ісуса Хрыста, да Найсьвяцейшай Тройцы, да Бога Духа Сьвятога, да найчысьцейшай Маці Божае, да свайго анёла ахоўніка і да ўсіх сьвятых, каб яны заступіліся за нас прад Богам.



Збаўца наш любіць усіх людзей, таксама й грэшнікаў, калі яны са шчыраю малітваю зьвяртаюцца да Яго, просяць выбачэньня грахоў. Але асабліва ён любіў і любіць дзяцей. Таму аднаго разу сказаў вучням Сваім: «Пусьцеце дзяцей, не перашкаджайце ім прыходзіць да Мяне, бо іхнае ёсьць валадарства нябеснае» (Мц.19:14). «І, узяўшы, абняў іх, узлажыўшы рукі на іх, і дабраславіў іх» (Мк. 10:16).

Таму трэба бязупынна маліцца ў радасьцях і пры ўсякіх удачах нашых, маліцца і горы, бядзе, смутку й турботах. Маліцца стала за сябе і за іншых ды прасіць другіх маліцца за нас, бо: «Вялікую мае сілу гарачая малітва справядлівага» (Якуб 5:16). «Дабраславё ны Бог, бо ён не адхінуў малітвы мае ані ласкі Свае ад мяне» (Пс. 65/66:20).



## МУДРАСЬЦЬ
(Выняткі з апостальскіх лістоў)

•Бо так палюбіў Бог сьвет, што Сына Свайго адзінароднага аддаў, каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, але меў жыцьцё вечнае» (Ян.3:16).

«Ісус кажа яму: "Я - дарога і пра}'да і жыцьцё; ніхто няпрыходзіць да Айца, як толькі празь Мяне"» (Ян 14:6).

«Вер у Госпада Ісуса і ўратуешся ты й дом твой» (Дзеі 16:31).

-Шчасьлівей даваць. чымся браць» (Дзеі 20:35).

«Бо як цела бяз духа мёртвае, так мё ртвая і вера бяз учынкаў» (Як. 2:26).

«Язык - малы орган, а шмат робіць. З тых-жа вуснаў выходзіць дабраславенства і кляцьба. Ня мае так быць, браты мае. Ці цячэ



з тае самае крыніцы салодкая і горкая вада?» (Як. 3:5, 10-11).

«Бо дзе зайздрасьць і сваркі, там ладу няма. а толькі ўсё благое» <Як. 3:16).

«Дзень Госпада прыйдзе, як злодзей уночы,і тады з грукатам неба міне, і навалы, разгарэўшыся, растопяцца, і зямля ды ўсё, што зроблена на ёй згарацъ. Але расьцеце ў ласцы і ў веданьні Госпада і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста» (2Пёт. 3:10, 18).

«Хто кажа, што ё н у сьвятле, а ненавідзіць брата свайго, той у цямноце дагэтуль» (ІЯн 2:9).

«Бог - гэта любоў,і той, хто трывае ў любові, прабывае ў Богу, а Бог у ім» (ІЯн 4:16).

«Бо адплата за грэх - сьмерць, але ласка Божая - гэта вечнае жыцьцё ў Хрысьце Ісусе, Госпадзе нашым» (Рым. 6:23).

«Бо ўважаю, што цяперашнія цярпеньні не раўня тэй славе, якая аб'явіцца нам» (Рым. 8:18).

«Калі Бог за нас,хто супраць нас?» (Рым. 8:31).

«Лютасьць часткова сталася ў Ізраэлі, аж пакуль ня ўвойдзе поўны лік паганаў, і гэтак увесь Ізраэль збавіцца, як напісана: "Прыйдзе з Сыё ну Выбавіцель і адверне бязбожбожнасьць ад Якуба; і гэта ўмова ім ад Мяне, як Я здыму зь іх грахі іхныя"» (Рым. 11:25-27).

«У надзеі цешцеся, у горы будзьце вытрывалымі, у малітве сталымі. Цешцеся з тымі, што радуюцца, і плачце з тымі, што плачуць» (Рым.12:12, 15).

«Бо валадарства Божае - ня ежа ані піцьцё, але справядлівасьць і супакой і радасьць у Духу Сьвятым» (Рым. 14:17).



«Ня бачыла таго вока і вуха ня чула, і ня прыходзіла тое на сэрца чалавеку, што прыгатаваў Бог тым, хто любіць Яго» (ІКар. 2:9).

«Бо хто зь людзей ведае, што ёсьць у чалавеку, апрача духа людзкога, які ў ім. Гэтак і Божага ніхто ня ведае, апрача Духа Божага» (ІКар. 2:11).

«Цяпер трываюць тры: вера, надзея, любоў,але болыпая зь іх - любоў» (ІКар. 13:13).

«Але ў царкве хачу лепш сказаць пяць словаў розумам сваім, каб і іншых навучыць, чымся дзесяць тысячаў на незразумелай мове. Браты! Ня будзьце дзеці розумам: на благое будзьце дзяцьмі, але розумам будзьце дарослымі» (ІКар. 14:19-20).

«Адна слава сонца, іншая месяца, іншая зоркаў,бо й зорка ад зоркі розьніцца славаю» (1 Кар. 15:41).



Хрыстос, «Які ўчыніў нас здольнымі быць слугамі Новага Запавету - ня літары, але духа, бо літара забівае. а дух ажыўляе» (2Кар. 3:6).

«Бо мы ведаем, што калі зямны наш дом, гэтае цела, разваліцца, мы маем хароміну ад Бога, дом ня рукамі збудаваную, вечны ў нябёсах» (2Кар. 5:1).

«Дык хто ў Хрысьце, той ужо новае стварэньне,старое мінула, усё стала новае» (2Кар. 5:17).

«Кожны чалавек, паводле пастановы сэрца, няхай дае ня зпрынукі, неахвотна, бо Бог любіць тых, хто ахвоча дае» (2Кар. 9:7).

«Але ён сказаў мне: "Даволі табе ласкі Мае, бо сіла Мая дасканаліцца ў кволасьці". І затым я буду найахватней хваліцца сваймі кволасьцямі, каб знаходзілася ўва мне сіла Хрыстовая» (2Кар. 12:9).



«Справядлівы - вераю жыць будзе» (Гал. 3:11).

«Учынкі цела ведамыя, яны: чужалоства, самалюбства, распуста, нечысьціня, блуд, ідалапаклонства,чары, нянавісьць, спрэчкі, зайздрасьць, гнеў, нязгода, падманы, падзелы, гэрэзіі, забойствы, п'янства, буянства і да гэтых падобныя. Кажу наперад, як і раней казаў,што тыя,хто гэтак чыніць, не здабудуць валадарства Божага. Плод-жа духа: любоў, радасьць, супакой,цярплівасьць, зычлівасьць, дабрыня, вернасьць, лагоднасьць, валоданьне сабою. На гэткіх няма закону» (Гал. 5:19-23).

«Не ашуквайце сябе. 3 Бога ніхто не насьмяецца. Бо што пасее чалавек, тое й пажне. Бо хто сее ў цела сваё, пажне расклад; а хто сее ў Дух, з Духа пажне жыцьцё вечнае. Робячы дабро, не безнадзейся; бо ў пару пажнем, калі не аслабеем» (Гал. 6:7-9).

Бог: «І ўсё паддаў пад ногі Ягоныя, і даў Яму быць галавою над усім у царкве» (Аф.1:22).

«Адзін Госпад, адна вера, адзін хрост» (Аф. 4:5).

«Абураючыся, не грашэце; сонца-няхай ня зойдзе ў гневе вашым. Будзьце зычлівыя адзін да аднаго, справядлівыя, выбачаючы адзін аднаму, як і Бог у Хрысьце выбачыў вам» (Аф.4:26,32).

«Хто любіць жонку сваю, любіць самога сябе- (Аф.5:28).

«Бо мне жыцьцё - Хрыстос. сьмерць - набытак» (Піл.1:21).

«Усё магу ў Хрысьце, Які ўзмацняе мяне» (Піл. 4:13).

«І калі што-колечы вы робіце словам або ўчынкам, рабеце ўсё ў імя Госпада Ісуса, дзякуючы празь Яго Богу Айцу» (Кал. 3:17).



«Заусё ды радуйцеся. Бязупынку малецеся. За ўсё дзякуйце, бо гэта ёсьць пра вас воля Божая ў Хрысьце Ісусе» (1Сал. 5:16-18).

«Няхай ніхто не зьвядзе вас ніякім спосабам! Бо гэтага ня будзе, пакуль ня прыйдзе спачатку адступленьне і не аб'явіцца чалавек бяспраўя, сын загубы, што працівіцца й вывышаецца над усё, званае Богам або сьвятасьцяй, і пакуль ён не засядзе ў сьвятыні Божай, паказваючы сябе, што ён Бог» (2Сал. 2:3-4).

«Дух-жа ясна кажа, што ў апошнія дні адступяць некаторыя ад гэтае веры, слухаючы духаў, што спакушаюць, і навукаў дэманавых» (1Цім. 4:1).

«Калі-ж хто пра сваіх собскіх і асабліва пра хатніх ня рупіцца, той адрокся веры і горшы за нявернага» (1Цім. 5:8).

«Бо даў нам Бог духа ня боязі, але



магутнасьці, і любові, і цнатлівасьці» (2Цім. 1:7).

«Усё Пісаньне дадзенае натхненьнем Божым,карыснае да вывучэньня і дакору, да папраўы, да навучаньня справядлівасьці, каб чалавек Божы быў дасканалы, поўнасьцю прыгатаваны да кожнага добрага ўчынку» (2Цім. 3:16-17).

«Змагаўся я добрым змаганьнем, бег скончыў, веру захаваў. Адгэтуль гатуецца мне вянок справядлівасьці, які дасьць мне Госпад, справядлівы Судзьдзя, таго дня; і не адно мне, але таксама ўсім, што палюбілі зьяўленьне Яго» (2Цім. 4:7-8).

«Гэтае кажы і ўгаворвай і дакарай з усё ю ўладаю, каб ніхто ня меў да цябе пагарды» (Ціт. 2:15).

«Бо слова Божае жывое й дзеючае і вастрэйшае за ўсякі меч двусечны» (Жыд. 4:12).



• Вось-жа вера - гэта ўжыцяўленьне таго, на што спадзяёмся, і перакананасьць у тым, чаго ня бачым- (Жыд. 11:1).

•Я ё сьць альфа і амэга - пачатак і канец, кажа Госпад, які ё сьць, і быў, і прыйдзе, Усемагутны- (Адкр. 1:8).

«Той, хто сьветчыць гэта, кажа: "Запраўды Я прыйду хутка". Амін. Але прыходзь, Госпадзе Ісусе!» (Адкр. 22:20).

## А Н Ё Л Ы

Анёл, значыць - пасланец, бо Госпад Бог пасылае анё лаў абвяшчаць людзям Сваю волю, атаксама памагаць ім, навучаць усякага дабра.

Калі Бог стварыў анё лаў? Бог стварыў іх раней за ўвесь бачаны намі сьвет, а гэтым раней за чалавека. Анё лы - гэта бесьцялесныя

духі, якія могуць прыймаць вобраз чалавека, калі Богу гэта люба й патрэбна.

Анё лы дзеляцца на добрых і благіх. Бог стварыў усіх анё лаў добрымі, але начальнік над імі, Шатанаэль, выступіў супроць Бога з прычыны пыхі свае: захацеў сам стацца Богам і пырмануў да сябе частку анё лаў. За гэта Бог пакараў іх: выкінуў зь неба. Канчатак -ЭЛЬ, што значыць Божы, адпаў і Шатанаэль стаўся Шатанам, а ўсе анё лы ягоныя — д'ябламі, злыднямі. Хрыстос назваў Шатана князем цемры, айцом ілжы і ўсякага ліха, бо ён і слугі ягоныя - ворагі Бога і спакусьнікі людзей.

Добрыя, Божыя анёлы служаць Богу: пяюць хвалу Яму ля пасаду Яго, у Царкве Нябеснай. Але й зямную царкву яны бароняць, сьпяваюць разам з намі, пама-гаюць нам у малітвах нашых, просяць Бога за нас, бо ўсе яны вялікія прыяцелі нашыя, цешацца, калі мы чынім дабро.

Ня ўсе анёлы роўныя ў славе.



Яны дзеляцца на дзевяць чыноў, паводле таго, як блізкаля пасаду Божага прабываюць. Пры самым пасадзе Божым прабываюць херувімы й сэрафімі. Далейшыя станы: пасады, сілы, улады, начальствы, пачаткі, арханё лы і анё лы.

Якія анёлы называюцца ахоўнікамі? Кожнаму з нас пры сьв. хросьце Бог дае анёла ахоўніка, які стала памагае нам: бароніць нас ад усякага ліха голасам нашага сумленьня, і вядзе нас на шлях дабра. Калі-ж нехта ня слухае голасу яго, доўга й стала грашыць, тады анё л адыходзіць, і месца яго займае д'ябал.

Што мы павінны рабіць, каб з намі ня сталася такое няшчасьце? Прасіць свайго анё лаахоўніка памагчы нам каяцца ў грахох, памагчы нам зьяднацца з Госпадам Богам дарогаю шчырых малітваў, посту й добрых учынкаў, стала памятаючы, што Госпад Бог не жадае сьмерці грэшніка, а хоча,каб усе збавіліся.



## СЬВЯТЫЯ ТАІНСТВЫ

Таінства - гэта такая боская дзея, у часе якой Госпад Бог нябачна пасылае ласку й сілу найсьвяцейшага Духа таму, над кім гэтая боская дзея дзеецца. Сьвятыя Таінствы ўстанавіў Сам Ісус Хрыстос, Сын Божы, Сваім хростам на Ярдане, Сваімі заклікамі да каяньня, Сваёю прысутнасьцю й цудам на вясельлі ў Кане Галілейскай, асабліва-ж Сваё ю Тайнаю Вячэраю і пераданьнем боскае ўлады Свае сьвятым апосталам выбачаць грахі людзям. Сьвятыя Таінствы - гэта той цудоўны сродак, дадзены нам Богам Сынам, які дазваляе кожнаму з нас стацца ўлюбё ным, сьвятым.

Малітвамі й добрымі ўчынкамі мы імкнемся да супольнасьці з Богам. Але гэтага мы ня зможам дасягнуць сваймі сіламі. Таму Ісус Хрыстос, Збаўца наш, устанавіў у Сваё й Царкве сьвятыя Таінствы. як помач нам у нашым дасканаленьні.

У сьвятым Таінстве хросту мы, ласкаю Духа Сьвятога й вадою, змываем зь сябе наш грэх першародны і нараджаемся духова, каб стацца слугамі Ісуса Хрыста.

Таму гэты вялікі дар Божы, на які мы яшчэ не заслужылі, але атрымалі ад Бога пры хросьце, мы павінны бязупынна трымаць і разьвіваць сілаю свайго собскага духа. Мы павінны множыць усе нашыя здольнасьці, якія мы атрымалі ад Госпада Бога, Айца нашага нябеснага. Але ці мы запраўды іх памнажаем? На жаль, мы памалу пачынаем грашыць, асабліва тады, калі ад родных і хросных бацькоў не атрымалі належнага хрысьціянск а г а ўзгадаваньня.

І грахі нашыя «вырастаюць вышэй нашае галавы», і ўратаваць сябе самі мы ўжо ня можам, як ня можам «выцягнуць сябе за валасы з вады». Аднак для адчаю тут няма месца, бо гэта прадбачыў Збаўца наш у Сваім сьвятым Таінстве каяньня-споведзі і сьвятога прычасьця.

Ён, як Бог і Чалавек, ведае ўсе цяжкасьці сямейнага жыцьця ды вялікія абавязкі бацькоў пры ўзгадаваньні дзяцей іхных. Ён прыйшоў з дапамогаю - сьвятым Таінствам шлюбу-сужэнства, у якім дае Сваю адмысловую ласку для пабожнага хрысьціянскага сямейнага жыцьця.

Цяжка хворы чалавек спадзяецца сьмерці, са страхам бачыць, як часта й моцна грашыў у жыцьці сваім, як зьневажаў дабрыню Божую. І тут Госпад міласэрны сьпяшаецца яму з дапамогаю: Сваім сьвятым Таінствам алеяпамазаньня. У апошнюю часіну праяўляе ласку Сваю, бо ўсім жадае збавіцца.

## Ц А Р К В А

Царква - гэта грамада людзей, аб'яднаных праваслаўнаю employing верою ў Госпада й Збаўцу нашага Ісуса Хрыста, якая пасьвячаецца сьвятымі Таінствамі й малітвамі ды кі-



руецца на спасеньне япіскапамі й сьвятарамі. Царква - гэта нярэчыўнае цела Хрыстовае.

Сьв. Царкву ўстанавіў на зямлі Сам Ісус Хрыстос, і Ён - вечны Першы Ярарх, Галава яе. Спосаб існаваньня, парадак службаў і кіравецтва Царквы ўлажылі сьвятыя апосталы й айцы, і яны ўстанавілі, што вонках Царквы няма збаўленьня.

Кожны. хто жадае збаўленьня, павінен ведаць пра сваю сьвятую Царкву. Царква, як нярэчыўнае цела Хрыстовае, на чале з Хрыстом - гэта духоўнае паняцьце, як і сьвятыя Таінствы. Мы звычайна называем царквою будынак сьвятыні, ці інакш - будынак сьвятога храму. Трэба ведаць аднак розьніцу паміж Царквою, целам Хрыстовым, і царквою-будынкам, месцам багаслужбаў і малітваў.

Госпад Бог наш Ісус Хрыстос перш за ўсё ў сьвятыні прабывае, таму й будуецца яна іначай, чымся іншыя будынкі. Гэта сьвятыня Божая, дом Госпада, як ска-



заў прарок: «Узрадаваўся я, калі сказалі мне: пойдзем у дом Госпадаў» (Пс. 121/122:1). А Хрыстос сказаў: «Дом Мой - домам малітвы» (Мц. 21:13).

Гэта ня толькі пасьвячанае, але й сьвятое месца, бо тут вернікі прыносяць малітвы Госпаду і ў сьвятых Таінствах і прымаюць дары Духа Сьвятога, асабліва найчысьцейшае Цела й дарагацэнную Кроў Госпада нашага Ісуса Хрыста, і гэтымі дарамі ўсьведамляюцца.

Як хрысьціянін мае паступаць у храме? Ня толькі прыстойна, але й пабожна,са страхам Божым у сэрцы сваім. Увайшоўшы ў храм, тры разы перажагнайся і кожны раз пакланіся, пасьля ўкленч перад абразом, памаліся, ды ў супакоі й радасьці займі сваё месца.

Калі пачнецца багаслужба, зь любоўю прымай удзел у ёй. Ня думай пра нішто іншае як толькі пра задзіночаньне з Госпадам Богам. Нават ціха зь нікім не гавары без патрэбы, ведай: стаіш перад Самым Госпадам. Уважай на



словы багаслужбы, у належным часе жагнайся, станавіся на калені, сьпявай разам зь людзьмі. Асабліва ўважліва слухай словы сьв. Апостала і сьв. Евангельля,а таксама казань сьвятара.

Ці павінен хрысьціянін дбаць пра чысьціню сваё й сьвятыні? Гэта сьвяты й радасны абавязак кожнага верніка. Ён павінен не шкадаваць ані часу, ані сродкаў, каб сьвятыня заўсё ды была мілая Богу й людзям: упрыгожаная, чыстая, прываблівая. Кожная ахвяра ягоная на царкву - гэта падарак Богу, як знак веры й любові да Яго. «Багаты дае з багацьцяў сваіх, а бедны з убогасьці свае». Збаўца наш пахваліў бедную ўдаву, якая палажыла ў скарбонку сьвятыні два грошы, і сказаў: «Запраўды кажу вам, што гэтая бедная ўдава ўкінула балей, чымся ўсе, што кідалі ў скарбонку; бо ўсе кідалі з дастатку свайго, але яна зь нястачы свае ўкінула ўсё, што мела, усё, што мела на жыцьцё сваё » (Мк. 12:43-44).

Не сьпяшайся выходзіць з храму. Чакай, калі сьвятар дабраславіць сьв. крыжам усіх пасьля цалаваньня. А калі выходзіш, таксама тры разы перажагнайся, гледзячы на іканастас і зь любоўю кажы: «Слава Табе, Божа, слава Табе! Слава Табе, найчысьцейшая Божая Маці! Слава Табе,мой анёле ахоўніку, і вам, усе анёлы сьвятыя! Слава вам, усе ўгоднікі Божыя! Амін».

Радасьць твая будзе поўная, бо дабраславеньне Божае будзе з табою.

## ВЫНЯТКІ З КАТЭХІЗІСУ

Два галоўныя запаветы Збаўцы нашага Ісуса Хрыста:

1. Любі Госпада Бога свайго ўсім сэрцам сваім, усёю душою сваёю і ўсім разуменьнем сваім.

Гэта першы й галоўны запавет, а другі падобны:

2. Любі бліжняга свайго, як самога сябе.



## ДЗЕСЯЦЬ ЗАПАВЕТАЎ БОЖЫХ

1. Я - Госпад Бог твой, няхай ня будзе ў цябе іншых багоў, апрача Мяне.
2. Не рабі сабе ку^міра, ані чагось падобнага да таго, што на небе ўгары, што на зямлі ўнізе, што ў вадзе ніжэй зямлі: не пакланяйся ім і ня служы ім.
3. Не кажы імені Госпада Бога твайго дарма.
4. Памятай дзень сыботні, яго сьвяткуй: шэсьць дзё н працуй, зрабі ў іх усю работу сваю, а сёмы дзень, сыботу, пасьвяці Госпаду Богу твайму.
5. Шануй бацьку свайго й маці сваю, каб добра табе было, і каб доўга жыў на зямлі.
6. Не забівай.
7. Не пералюбнічай.
8. Не крадзі.
9. Ня сьветчы ілжыва на бліжняга свайго.
10. Не пажадай сабе нічога з таго, што належыць бліжняму твайму.



## ЦНОТЫ БОЖЫЯ

1. Вера.
2. Надзея.
3. Любоў.

## ЦНОТЫ МАРАЛЬНЫЯ

1. Мудрасьць.
2. Справядлівасьць.
3. Мужнасьць.
4. Устрыманасьць.

## ГАЛОЎНЫЯ ЦНОТЫ І ПРАЦІЎНЫЯ ІМ ГРАХІ

1. Пакора - пыха.
2. Шчодрасьць - прагавітасьць.
3. Сарамлівасьць - бессаромнасьць.
4. Спагадлівасьць - зайздрасьць.
5. Мернасьць - абжорства і п'янства.
6. Лагоднасьць - гнеў.
7. Працавітасьць - гультайства.



## СЕМ ДОБРЫХ УЧЫНКАЎ ДЛЯ ДУШЫ БЛІЖНЯГА

1. Грэшніка паправіць.
2. Таго, хто ня ўмее, навучыць.
3. Таму, хто сумляецца, даць добрую параду.
4. Сумнага пацешыць.
5. Прыкрасьць цярпліва перанесьці.
6. Крыўды шчыра выбачыць.
7. Маліцца за жывых і па-мерлых.

## СЕМ ДОБРЫХ УЧЫНКАЎ ДЛЯ ЦЕЛА БЛІЖНЯГА

1: Галоднага накарміць.
2. Смаглага напаіць.
3. Голага апрануць.
4. Падарожнаму даць прытулак.
5. Хворага адведаць.
6. Вязьню паспагадаць.
7. Памерлага пахаваць.

## ГРАХІ СУПРАЦЬ СЬВЯТОГА ДУХА

1. Празьмерная надзея на Божае міласэрдзе.

2. Безнадзейнасьць на спасеньне, або адчай.

3. Непакорлівасьць Хрыстовай навуцы.

4. Зайздрасьць бліжняму Божае ласкі.

5. Закамянеласьць у грахох.

6. Адкладаньне каяньня аж да сьмерці.

## ГРАХІ, ЯКІЯ ВЫКЛІКАЮЦЬ БОЖУЮ ПОМСТУ

1. Забойства.
2. Жывё лапералюбнасьць.
3. Крыўдзіць удоваў і сіротаў.
4. Стрымваць заработную плату работніку.



## ЧУЖЫЯ ГРАХІ З НАШАЕ ВІНЫ

1. Прынаджваць да грэху.
2. Намаўляць да грэху.
3. Загадваць, раіць грашыць.
4. Дазваляць грашыць.
5. Таіць грэх.
6. Спрыяць грэху.
7. Хваліць грэх.
8. Не караць за грэх.
9. Бараніць грэх.

## ПЯЦЬ УМОВАЎ ДОБРАЕ СПОВЕДЗІ

1. Падлік сумленьня.
2. Жаль за грахі.
3. Пастанова паправіцца.
4. Споведзь.
5. Адбыцьцё пакуты.

## СЕМ СЬВЯТЫХ ТАІНСТВАЎ

1. Хрост.
2. Мірапамазаньне.
3. Споведзь.



4. Прычасьце.
5. Сьвятарства.
6. Шлюб.
7. Алеепамазаньне.

## ЦАРКОЎНЫЯ НАКАЗЫ

1. Сьвяткаваць установленыя сьвяты.
2. У нядзелі й сьвяты пабожна браць удзел у багаслужбах.
3. Датрымоўваць установленыя пасты.
4. Ня менш як раз ў Вялікі Пост, спавядацца й прычашчацца.
5. Вясельляў ды ігрышчаў узабароненым часе не спраўляць.

## ВАЖНЕЙШЫЯ ПРАЎДЫ ВЕРЫ

1. Ёсьць адзін Бог, Які ўсё стварыў і ўсім гаспадарыць.
2. Бог - справядлівы судзьдзя, Які за дабро ўзнагараджае, а за ліха карае.



3. Бог у трох асобах: Бог Айцец, Бог Сын, Бог Дух Сьвяты, што завем адным імём: Сьвятая Тройца.
4. Сын Божы стаў Чалавекам, памёр на крыжы дзеля нашага збаўленьня, уваскрос і ўзьнёсься на неба.
5. Сьвяты Дух, Які паходзіць ад Айца.зыйшоў на апосталаў і адухаўляе сьвятую Царкву.
6. Душа чалавека несьмяротная.
7. Да спасеньня абавязкава патрэбныя: Божая ласка, вера і добрыя 5'чынкі.
8. Па сьмерці чалавека душа яго ная знаходзіцца ў стане адчуваньня вечнага шчасьця або вечнага пракляцьця.
9. Царква, якую заснаваў Ісус Хрыстос на зямлі і Галавою якое Ен зьяўляецца, ёсьць адзіная сьвятая сусьветная і апостальская.
10. Усе народныя праваслаўныя цэрквы, што непарушна вызнаюць догмы й каноны,складаюць адну Сьвятую Сусьветную Апостальскую Саборную Хрыстовую Царкву.

Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква - частка Сусьветнае Праваслаўнае Хрыстовае Царквы.



ЗЬМЕСТ

Ранішнія малтвы 7
Уладару нябесны 7
Найсьвяейшая Тройца 8
Ойча наш 8
Устаўшы ад сну 9
Малітва да сьв. Тройцы 11
Псалом 50/51 12
Сымбаль праваслаунай веры 14
Малітва сьв. Макара Валікага 15
Другая малітва сьв. Макара Вялікага 16
Слауленьне найсьвяцейшае Вагародзіцы 17
Трапар крыжа за народ 18
Малітва хвалы да найсьвяцейшае Багародзіцы 18
Малітва за жывых 19
Малітва за памерлых 21
Памяць пра маці 22
Малітва да свайго сьв. Іменьніка 23
Малітвы на працягу дня 23
Малітва перад пачаткам усякае працы 24
Малітва па заканчэньні праны 24
Малітва перад навукаю 24



Малітва пасьля навукі 25
Малітва перад ядою 26
Малітва пасьля яды 27
Малітвы перад сном 28
Вачорныя трапары 30
Малітва аб выбачэньні грахоў 31
Малітва сьв. Макара Вялікага 31
Малітва сьв. Антыёха 32
Малітва да найсьвяцейшай Багародзіцы 33
Вячорная малітва да сьв. Анёла Аохўніка 34
Малітва да найсьвяцейшае Багародзіцы 35
Атулі мяне 36
Розныя малітвы 37
Малітва супраць злога 37
Малітва каяньня й нашых просьбау да Госпада 38
Малітва перад споведзьдзю 39
Малітва каяньня 40
Малітва перад сьв. прычасьцем 43
Малітва перад самым сьв. прычасьцем 44
Малітва пасьля сьв. прычасьця 45
Малітва сьв. Васіля Валікага пасьля прычасьця 47
Малітва падзякі сьв. Амброзія 47



Малітва на чужыне да Божай Маці Жыровіцкай 49
Малітва да Божай Маці Жыровіцкай 51
Малітва на чужыне да сьв. Еўфрасіньні 53
Малітва да сьв. Кірылы Тураўскага 55
Малітва за бацькоў і родных 57
Малітва сіраты 59
Малітва бацькоў за дзяцей 60
Песьня дзіцяткі 61
Малітва хмаладога чалавека 61
Малітва падарожніка 62
Малітва цяжарнае 63
Малітва хворага 66
Малітва за хворага 67
Малітва на выздараўленьне хворага 68
Паручэньне сябе ў апеку найсьвяцейшай Дзеве Марыі 69
Малітва за палеглых на вайне 69
Малітва за Беларускі Народ 71
Малітва за Беларусь 74
Малітва на дабраславеньне 76
Малітва за ўсіх і за ўсё 76
Малітва на ўсякую патрэбу 77
Апошняя малітва перад сьмерцю 78

Малітва пры ўваходзе ў сьвятыню 80
Малітва за Беларусь (Магутны Божа) 81
Трапары, кандакі, пракімены, алілуяры й прычасьнікі 82
Сьпеў 1 82
Сьпеў 2 84
Сьпеў 3 85
Сьпеў 4 87
Сьпеў 5 88
Сьпеў 6 90
Сьпеў 7 91
Сьпеў 8 92
Вялікдзень 95
Трапары 12 сьвятам 96
Нараджэньне Хрыстовае 96
Хрост Госпада 99
Спатканьне Госпада 100
Зьмяненьне Госпадава 102
Падняцьце Крыжа Госпадавага 104
Уваход у Ерусалім Госпада 105
Узьнясеньне Госпадава 107
Сьвятая Тройца 109
Дабравешчаньне 110
Усьпеньне Вагародзоіцы 112
Нараджэньне Вагародзіцы 114
Увядзеьне Вагародзіцу ў сьвятыню 115


Сьвятым 117
Божай Маці Жыровцкай 117
Покрыва найсьвяцейшай Багародзозіцы 119
Сьв. Кірыла Тураўскі 120
Сьв. Еўфрасіньня Вялікая 121
Вялікоднае слова сьв. Яна Залатавуцнага 123
Пра малітву 126
Мудрасьць 132
Анёлы 141
Сьвятыя Таінствы 144
Царква 146
Выняткі з катэхізісу 150
Дзесяць запаветаў Божых 151
Цноты Божыя 152
Цноты хмаральныя 152
Галоўныя цноты і праціўныя ім грахі 152
Сем добрых учынкаў для душы бліжняга 153
Сем добрых учынкаў для цела бліжняга 153
Грахі супраць Сьвятога Духа 154
Грахі якія выклікаюць Божую помсту 154
Чужыя грахі з нашае віны 155
Пяць умоваў добрае споведзі 155


Сем Сьв. Таінстваў 155
Царкоўныя наказы 156
Важнейшыя праўды веры 156
Зьмест 159

Printed by Gorden & Gordon Associates P.O. Box 490.
Station "U", Toronto, Ontario. Canada  M8Z 5Y8